

# РАБОЧЫ ВІЗІТ У РАСІЮ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 25-26 верасня здзейсніць рабочы візіт у Расійскую Федэрацыю**

Кіраўнік дзяржавы возьме ўдзел у Глабальным атамным форуме, які пройдзе пад дэвізам «Ад новага тэхналагічнага ўкладу — да новага светапогляду», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Плануецца, што падчас візіту таксама адбудзецца двухбаковая сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным.

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ВЕРАСНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 185 (30573)

# Я ВЫБРАЎ КАЛЕДЖ!

**Выпускнікі дзявятых і адзінаццатых класаў сёння хочуць хутчэй стаць на ногі, быць самадастатковымі, таму выбіраюць навучанне на ўзроўні ССА або ПТА**

ВІТРАЖЫ майстэрства

Рэальнасць такая, што цяперашняя моладзь сапраўды вітае хуткі выхад на рынак працы і ранняе дасягненне аўтаноміі ад бацькоў — юнакі і дзяўчаты цэняць фінансавую незалежнасць і хочуць прымаць рашэнні самастойна. Усё часцей падлеткі разумеюць, што навучанне на рабочую спецыяльнасць — гэта надзейная сініца ў руках. А бацькі паступова пазбаўляюцца ад стэрэатыпу, што непаступленне ў ВНУ азначае жыццёвую няўдачу. І каледжы ўжо не ўспрымаюцца як запасны варыянт для школьнікаў, якія не паспяваюць, іх не называюць грэблівым словам «хабза» — наадварот, цяпер яны становяцца ўсвядомленым выбарам тых, хто імкнецца да хуткага прафесійнага старту.

СТАР. 12–13






Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ГАЛОЎНАЕ, КАБ БЫЛА ІНІЦЫЯТЫВА 6



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25185>

9 771990 763008

ПРЭМ'ЕРА ПРАЕКТА

# PRO ЭКАНОМІКУ — ПРАФЕСІЙНА І ЗРАЗУМЕЛА

Аб тым, што эканоміка — пытанне нумар адзін у развіцці і суверэнітэце дзяржавы, наш Прэзідэнт гаворыць пастаянна. «Будзе эканоміка — не будзе вайны» — яшчэ адзін важны і актуальны для ўсіх тэзіс нашага лідара. Беларусы, напэўна, ужо зразумелі, што ад эканомікі краіны залежыць, наколькі добра будзем жыць усе разам і кожны паасобку.

А ці задумваліся вы, які гэта складаны, велізарны механізм — эканоміка краіны, якія шматкрокавыя, шматузроўневыя працэсы ў ёй адбываюцца, каб — як вынік — быў суверэнітэт, не было вайны і людзі жылі ў дастатку. Асабліва ў наш неспакойны час, калі ў суседняй краіне ваююць, калі абрынуліся санкцыі, калі ідзе перадзел уплыву ў свеце, а Беларусь — так нам наканавана — на важным геапалітычным скрыжаванні.

У новым праекце «Звязды» PROэканоміку мы ставім на мэце сваім чытачам гэта патлумачыць. PRO ў міжнароднай лексіцы азначае «прафесійны». Менавіта так — прафесійна і даступна, з прыцягненнем экспертаў, з якаснай уласнай аналітыкай мы і мяркуем расказваць пра эканоміку. А калі прасцей — пра тое, з чаго і як складаецца наш з вамі дабрабыт.

СТАР. 7–10

ПАСЛЯ РАЗМОВЫ

# «ЗЫХОДЗЯЧЫ З НАШЫХ РЭСУРСНЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ»

## Аляксандр Турчын — пра задачы на наступныя пяць гадоў і формулу справядлівай цаны

У аўторак, 23 верасня, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам Прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына. Пасля размовы ў беларускага лідара кіраўнік Саўміна адказаў на пытанні журналіста тэлеканала «Беларусь-1».



### «З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ РЭАЛЬНАСЦІ ВЫКАНАННЯ ПАРАМЕТРАЎ»: АБ ПЛАНАХ ПА РАЗВІЦЦІ КРАІНЫ НА ПЯЦІГОДКУ

У прыватнасці, у цэнтры ўвагі была праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця. Прэм'ер-міністр адзначыў, што яна распрацоўвалася зыходзячы з існуючых магчымасцяў.

— Нам яшчэ трэба будзе зацвердзіць новую Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступную пяцігодку. Кіраўнік дзяржавы адобрыў канцэптуальныя падыходы, — адзначыў Аляксандр Турчын. — Мы падыходзілі да распрацоўкі праграмы з пункту гледжання рэальнасці выканання параметраў, якія закладваем у гэтай праграме. Ну і перш за ўсё зыходзячы з нашых рэсурсных магчымасцяў, таму што можна будаваць і выдаваць нейкія цікавыя, фантастычныя ідэі, але трэба разумець, колькі каштуе іх рэалізацыя. Гэта значыць, будаўніцтва любога аб'екта, развіццё галіны — усё патрабуе рэсурсаў. І мы разумеем аб'ёмы рэсурсаў нашай эканомікі, аб'ёмы бюджэту, аб'ёмы рэсурсаў банкаўскай сістэмы, прыблізна разумеем аб'ёмы ўласных сродкаў у прадпрыемстваў. Зыходзячы з гэтага пастулату, мы і прымалі рашэнне аб магчымасцях нашай эканомікі развіваць тыя ці іншыя сферы.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што сёння людзей хвалююць дарогі, жыллё, жыллёва-камунальная гаспадарка.

— Мы разумеем, што ў XXI стагоддзі ўзровень гэтых рэчаў павінен адпавядаць сучаснаму развіццю грамадства. Таму значную частку грошай, дзясяткі мільярдаў рублёў, мы сёння накіроўваем менавіта ў гэтыя сферы, — дадаў ён.

Паводле яго слоў, у прыярытэце і развіццё сферы паслуг.

— Структура нашай эканомікі сведчыць, што ўдзельная вага сферы паслуг ВУП павінна павялічвацца. І гэта галіна нашай эканомікі павінна атрымаць апераджальнае развіццё, тым больш у нас ёсць нядрэнныя кампетэнцыі ў гэтым. У нас добрая гісторыя, прырода для таго, каб атрымліваць з гэтай галіны больш дывідэндаў, — упэўнены Аляксандр Турчын.

Прэм'ер-міністр таксама адзначыў важнасць інвестыцый у развіццё рэгіёнаў.

— Без інвестыцый развіццё краіны немагчыма. Зразумела, што па выніках васьмі месяцаў гэтыя паказчыкі нядрэнныя. Але ёсць індыкатары долі інвестыцый у ВУП, і да ўзроўню папярэдніх гадоў мы не дацягваем. Задача стаіць выйсці на тыя памеры прыцягнення інвестыцый, укладання інвестыцый, якія дазваляюць забяспечваць будучыню краіны, — пракаментаваў ён.

### «ЗНАЙСЦІ БАЛАНС ЗАЎСЁДЫ НЯПРОСТА»: АБ ФОРМУЛЕ СПРАВЯДЛІВАЙ ЦАНЫ

Прэм'ер-міністр у гутарцы з журналістам таксама акцэнтаваў увагу на тым, што пытанні ўзроўню заработнай платы, рост цэн больш за ўсё хвалююць людзей. А перад дзяржавай стаяць задачы збалансаванасці і пытанні формулы справядлівай цаны.

— Гэта цана павінна быць справядлівая для ўсіх, наколькі гэта магчыма: і для вытворцы, і для прадаўца, і для спажыўца. Знайсці гэты баланс заўсёды вельмі няпроста, — упэўнены Аляксандр Турчын. — Ёсць аб'ектыўныя эканамічныя перадумовы росту інфляцыі, ад якіх нікуды не дзенешся. Я заўсёды прыводжу ў прыклад рост зарплаты ў нашай краіне. Людзі павінны атрымліваць больш — гэта відавочна. Але ў сярэднім у нас у эканоміцы доля заработнай платы ў сабекошце прадукту ў сярэднім складае 25 %. Два гады запар у нас назіраецца рост рэальнай заработнай платы — летась на 10 %, сёлета таксама на 10 %. І гэта не можа не ўплываць на сабекошт прадукцыі і, адпаведна, на ўзровень цэн. Таму што сёння нашы прадпрыемствы не валодаюць такім узроўнем рэнтабельнасці, каб за кошт павышэння сабекошту выпускаемай прадукцыі канчатковая цана тавару заставалася такой жа. Таму мы, вядома, дзесьці будзем цану гэту павышаць.

Аляксандр Турчын акцэнтаваў: нельга прымаць рашэнні на шкоду ўдзельнікам рынку.

— Нельга, каб прадпрыемствы выраблялі прадукцыю сабе ў страту. Трэба, каб нейкі ўзровень рэнтабельнасці быў і ў прадпрыемствах гандлю. І самае галоўнае — каб для насельніцтва ўзровень цэн быў прымальны, — падкрэсліў ён.

Аляксандр Турчын зноў прывёў прыклад з яблыкамі.

— Склаліся анамальныя ўмовы надвор'я, і мы атрымалі значна меншы ўраджай (яблыкаў. — Заўв. рэд.). Але фермер, які вырасціў гэтыя яблыкі, павінен хоць бы трохі на гэтым зарабіць. У гэтых умовах аб'ектыўна цана на яблыкі будзе вышэйшая, чым летась. Дзяржава як рэгулятар павінна сёння знайсці баланс, каб і фермеру даць трохі зарабіць, але каб цана не вырасла ў 3-4 разы. Тавар у краме павінен прадавацца па той цане, якая будзе не на шкоду вытворцу. Трэба Таксама, каб і гандаль нейкую мінімальную сваю надбаўку атрымаў, — адзначыў ён і падкрэсліў, што ў выніку павінна скласціся справядлівая цана для спажыўца.

**Па матэрыялах БелТА.**

# ДЗЕЛЯ ДАБРАБЫТУ РАЗВІЦЦЯ

## Эксперты — аб задачах, пастаўленых

У аўторак Прэзідэнт прыняў з дакладам Прэм'ер-міністра. Абмяркоўвалася шырокае кола пытанняў, якія датычацца не толькі выканання ўрадам даручэнняў кіраўніка дзяржавы, а ў цэлым паспяховага функцыянавання эканомікі ў сучасных умовах. Аляксандр Лукашэнка агучыў Аляксандру Турчыну недахопы ў канкрэтных галінах, спыніўся і на станоўчых момантах. Пытаннем нумар адзін для кіраўніка Савета Міністраў вызначана прамысловасць. «Арганізоўвайце, напружвайце, прадавайце», — канкрэтызаваў задачу беларускі лідар, арыентуючы на павелічэнне экспарту. Акрамя таго, у Палацы Незалежнасці ішла размова аб рэалізацыі складскіх запасаў, узаемадзеянні з Казахстанам у авіяцыйнай сферы. Аляксандр Лукашэнка праінфармаваў, што ў выкананне пастаўленай раней задачы ў Нацыянальным банку фарміруецца група, якая будзе аналізаваць сітуацыю ў эканоміцы. Кіраўнік дзяржавы вельмі паглыблены ў тэму, а таму яго даручэнні — прадметныя і на перспектыву.

Аб важнасці задач, пастаўленых Прэзідэнтам перад Аляксандрам Турчыным і ў цэлым перад урадам, падзяліліся меркаваннямі нашы эксперты.

### «ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА — НАЙВАЖНЕЙШЫ СКЛАДНІК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ»



Як адзначыла **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і бяспецы, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа» Ала СМАЛЯК,** прымаючы з дакладам Прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына, Прэзідэнт у тым ліку звярнуў увагу на работу аграпрамысловага комплексу — кантроль вытворчасці, продажу, экспарт.

«Пытанне забеспячэння якасным і бяспечным харчаваннем у патрэбных аб'ёмах — у цэнтры пастаяннай увагі нашага Прэзідэнта, — канкрэтызавала сенатар. Харчовая бяспека — найважнейшы складнік нацыянальнай бяспекі. Гэта стрыжань стабільнасці, дабрабыту, аснова ўстойлівага развіцця краіны, захавання здароўя і якасці жыцця людзей».

Па словах Алы Смаляк, Беларусь на працягу многіх гадоў дэманструе прыклад сістэмнага, прадуманага падыходу да харчовай бяспекі. «Сёння мы маем высокую ступень самадастатковасці ў вытворчасці асноўных для нас відаў харчавання, — удакладніла яна. — Напрыклад, па вытворчасці збожжа і агародніны на душу насельніцтва наша краіна ўваходзіць у пяцёрку краін-лідараў СНД. Хаця яшчэ ў 1990-я (як многія памятаюць, а маладыя пакаленні з цяжкасцю ўяўляюць) пустыя паліцы ў прадуктовых магазінах былі рэальнасцю».

Сенатар акцэнтавала ўвагу на тым, што Беларусь узмацняе свае пазіцыі як удзельнік міжнароднага рынку харчовых тавараў. «Наша краіна здольна пастаўляць на экспарт шырокі асартымент высакаякаснай прадукцыі, — удакладніла яна. — І попыт, запыт на тавары пад маркай «Зроблена ў Беларусі» пастаянна расце». У прыклад член Савета Рэспублікі прывяла запуск новай лініі па вытворчасці цукерак з сухога малака, якія падабаюцца спажыўцам у Паднябеснай, Калінкавіцкім малочным камбінатам у супрацоўніцтве з кітайскім партнёрам. Мяркуецца, што рэалізацыя праекта дасць магчымасць прадпрыемству ў тым ліку нарасціць экспартную выручку.

### «У БЕЛАРУСКАЙ ПРАДУКЦЫІ ДОБРАЕ ІМЯ І НАДЗЕЙНЫ ІМІДЖ»



Аляксандр Лукашэнка звяртаў увагу, што пытанне нумар адзін для ўрада — прамысловасць. Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, энергетыцы, транспарце, сувязі і лічбавым развіцці Палаты прадстаўнікоў Юрыя ПАНФІЛАВА,** удзельная вага прамысловасці ў ВУП краіны складае трэцюю частку. «Па сутнасці, гэта драйвер эканомікі, — падкрэсліў дэпутат. — Замясціць чымсьці падзенне прамысловых паказчыкаў будзе складана. Таму Прэзідэнт і нацэльвае ўрад, Прэм'ер-міністра на неабходнасць актывізацыі работы ў гэтым кірунку».

Юрый Панфілаў звярнуў увагу на тое, што прадукты айчыннай вытворчасці сёння з'яўляюцца своеасаблівым брэндам Беларусі на міжнароднай арэне. «Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць камандзіроўка Старшыні Палаты прадстаўнікоў у В'етнам, дзе вялікая зацікаўленасць у нашай прадукцыі, найперш машынабудаўнічага профілю, — канкрэтызаваў дэпутат. — Рыхтуецца адказны візіт в'етнамскай дэлегацыі ў Беларусь: там вельмі цэняць нашы кампетэнцыі ў гэтай галіне. Паездка ў Егіпет засведчыла, што дзелавыя колы краіны вельмі зацікаўлены ў пастаўках аўтатэхнікі МАЗа (там створаны сэрвісныя цэнтры нашага прадпрыемства). МТЗ таксама зацікаўлены ў пастаўках прадукцыі на гэты рынак. Адным словам, наша прадукцыя на знешніх рынках вельмі запатрабавана. У яе добрае імя і надзейны імідж, бо мы не толькі прадаём, мы суправаджаем сваю прадукцыю яшчэ і сэрвісна».

### «НАША ЭКАНОМІКА ГОДНА СПРАВІЛАСЯ З ВЫКЛІКАМІ ЧАСУ, ЯКІЯ ВЫПАЛІ НА ГЭТЫ ПЕРЫЯД»



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Святлана БАРТАШ** звярнула ўвагу на тое, што эканоміка — адзін са складнікаў нацыянальнай бяспекі краіны, які

# ЛЮДЗЕЙ І ЎСТОЙЛІВАГА КРАІНЫ

## кіраўніком дзяржавы перад урадам

патрабуе сістэмнай работы. «2025-ы — апошні год пяцігодкі, у гэты перыяд закладваюцца асноўныя параметры далейшага развіцця краіны на бліжэйшую і сярэднетэрміновую перспектыву, — праінфармавала яна. — Падводзячы кароткі вынік, можна адзначыць наступнае: наша эканоміка годна справілася з выклікамі часу, якія выпалі на гэты перыяд. Гэта і кавід, і санкцыі, і пошук новых рынкаў збыту, і іншае».

Па словах дэпутата, у свеце запатрабавана якасная прадукцыя. «Яна мае свой цэнавы сегмент, патрэбнасць у пастаўках, аб'ёмах, таму невыпадкова бягучая пяцігодка аб'яўлена пяцігодкай якасці, — патлумачыла Святлана Барташ. — Мы ўсе разумеем, наколькі гэта важна. Кіраўнікі прадпрыемстваў, якія выкарыстоўваюць сыравіну, хочуць якасную прадукцыю для таго, каб вырабіць годны прадукт і рэалізаваць яго. Людзі хочуць купіць якасны тавар. Таму Прэзідэнт і трымае ўсе пытанні, можна сказаць, на ручным кіраванні: вельмі пільна сочыць за эканамічнымі паказчыкамі».

Дэпутат адзначае, што па выніках даклада сустрэчы Прэм'ер-міністра Прэзідэнту дакладна прасочваецца тэндэнцыя на пошук новых рынкаў збыту, своечасовага прыняцця рашэнняў па аб'ёмах вытворчасці канкрэтнага віду прадукцыі, якая не павінна ісці на склад, а будзе знаходзіць свайго спажыўца.

### «ТАКАЯ ПАТРАБАВАЛЬНАСЦЬ — ЗАЛОГ БУДУЧЫХ ПОСПЕХАЎ»



Па словах **члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктара Бярозаўскага раённага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі Таццяны ІГНАЦЮК,** даклад Прэм'ер-міністра Аляксандру Лукашэнку з'яўляецца не проста справаздачай, а своеасаблівай зверкай гадзіннікаў усёй вертыкалі ўлады. «Мінулая сустрэча стала яскравым прыкладам таго, як павінен працаваць гэты звязак: з абсалютным разуменнем стратэгічных задач і цвёрдым фокусам на іх практычным выкананні», — акцэнтавала ўвагу сенатар.

Парламентарый нагадала, што Прэзідэнт дакладна абазначыў «пытанне нумар адзін» для ўрада: «Арганізоўвайце, напружвайце, прадавайце!» «Гэта лаканічная формула, якая адносіцца да ўсіх нас, — канцэнтрат нашай бягучай эканамічнай палітыкі, — лічыць Таццяна Ігнацюк. — Размова ідзе не проста аб нарошчванні экспарту, а аб мабілізацыі ўсіх рэсурсаў, умені знаходзіць новыя рынкі і надзейна ўтрымліваць старыя».

«Беспрэцэдэнтная ўвага да аграпрамысловага комплексу сведчыць аб найвышэйшым прыярытэце харчовай бяспекі краіны, — канстатавала парламентарый. — Упэўнена, што такая патрабавальнасць — гэта залог будучых поспехаў. Яна дысцыплінуе, мабілізуе і канцэнтруе на галоўным. Нам ёсць чым ганарыцца ў аграпрамысловым комплексе, але няма мяжы дасканаласці. Задачы, пастаўленыя Аляксандрам Рыгоравічам, — гэта наш агульны арыенцір на наступны рывок у развіцці. Гэта і ёсць наша формула ўстойлівасці: адзінства, адказнасць і жорсткі кантроль на карысць кожнага жыхара Беларусі».

### «ПОСПЕХІ Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ — ВЫНІК ЗЛАДЖАНАЙ РАБОТЫ НА ЎСІХ УЗРОЎНЯХ»

Асобна падчас даклада Аляксандра Турчына Прэзідэнту гучала тэма сельскай гаспадаркі. Кіраўнік дзяржавы звяртаў увагу, што ўраджайнасць вышэйшая, чым у папярэднія гады. І гэта нягледзячы на ўмовы надвор'я, якія сёлета не спрыялі хлебаробам.



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Андрэй БАЛЫШ** удакладніў, што прыстойны вынік атрыманы ў найскладанейшых умовах. «Гэта бачна і па намалоце збожжа, ідзе ўборка плодаагародніннай прадукцыі, нарыхтоўка травяных кармоў, кукурузы, — канкрэтызаваў ён. — Гэта не выпадковасць, а заканамернасць. Пачынаючы з 2000-х гадоў, калі паступова пачалі працаваць праграмы адраджэння вёскі, аграбізнесу, сітуацыя ў сельскай гаспадарцы з кожным годам паляпшалася. Гэта вынік зладжанай работы на ўсіх узроўнях».

У аснове высокіх паказчыкаў у рабоце аграпрамысловага комплексу, па меркаванні парламентарыя, — няпростыя рашэнні, прынятыя Прэзідэнтам яшчэ ў далёкім 1994 годзе, накіраваныя на захаванне нашых прамысловых гігантаў. «На МТЗ, «Гомсельмашы» вырабляюць высакаякасную, канкурэнтаздольную сельскагаспадарчую тэхніку, — адзначыў дэпутат. — Ва ўмовах, калі з боку несяброўскіх краін ідзе адкрыты эканамічны шантаж, у кааперацыі з Расійскай Федэрацыяй мы ствараем неабходныя запчасткі — у выніку няма праблем, чым пасеяць і чым узараць».

### «ПАРЛАМЕНТ ГАТОВЫ ДА КАНСТРУКТЫЎНАЙ РАБОТЫ З УРАДАМ»



Чарговы рабочы даклад Прэм'ер-міністра Аляксандра Турчына Прэзідэнту Беларусі, па меркаванні **члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктара Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Ігара ЖУКА,** пацвярджае зладжанасць і эфектыўнасць узаемадзеяння дзяржаўных органаў у рэалізацыі стратэгічных задач.

«Аляксандр Лукашэнка дакладна акрэсліў праблемы, якія патрабуюць неадкладнай увагі: нягледзячы на тэмпы росту ВУП у 101,6 %, экспарт тавараў упаў на 2,5 %, а на складах застаюцца нерэалізаванымі 30 тысяч тон сметанковага масла, — канкрэтызаваў сенатар. — Дадзена даручэнне аб навядзенні парадку ў пытанні паставак свініны, пастаўлена задача жорсткага кантролю за аднаўленнем аб'ёмаў».

«Асаблівую важнасць мае даручэнне Прэзідэнта аб стварэнні ў Нацбанку аналітычнай групы для незалежнай адзнакі эканамічнай сітуацыі, — перакананы парламентарый. — Гэта рашэнне ўзмоцніць эфектыўнасць кантролю і дапаможа ў выпраўленні становішча ў такіх галінах, як прамысловасць і сельская гаспадарка. Парламент падтрымлівае такі патрабавальны курс і гатовы да канструктыўнай работы з урадам для дасягнення пастаўленых мэт».

**Вераніка КАНЮТА.**

НА КАНТРОЛІ

# ПРАВЕРКА НА РЭЗУЛЬТАТЫЎНАСЦЬ

## На Петрыкаўшчыне ўзмацняюць аграрную базу

У аўторак Аляксандр Лукашэнка прымаў з дакладам аб рабоце ў аграпрамысловым комплексе, праектах, якія рэалізоўваюцца ў Шклове і на Прыпяці, кіраўніка спраў Прэзідэнта Беларусі Юрыя Назарава. Прэзідэнт у тым ліку быў праінфармаваны аб ходзе будаўнічых работ малочнатаварнага комплексу гаспадаркі «Агра-Ляскавічы», будаўніцтве і вытворчасці ЛВЛ-бруса. Дарэчы, у мінулых нумарах «Звязда» ўжо пісала аб развіцці аграпрамысловага комплексу Шклоўшчыны. Цяпер жа наш карэспандэнт даведалася аб ходзе спраў на Петрыкаўшчыне, дзе працягваецца ўзвядзенне малочна-дайльнага блока і кароўнікаў для ўтрымання дойнага статка з укараненнем новых будаўнічых тэхналогій.

Узвядзенне адзначаных вытворчых аб'ектаў аграпрамысловага комплексу знаходзіцца на асабістым кантролі кіраўніка дзяржавы. Завяршыць аб'ект мадэрнізацыі плануецца да канца снежня. Нагадаем, што менавіта гэты малочнатаварны комплекс стаў адным з аб'ектаў, які наведаў Аляксандр Лукашэнка ў час свайго рабочага візіту ў Петрыкаўскі раён Гомельскай вобласці сёлета ў маі.

У сераду кіраўнік спраў Прэзідэнта Беларусі, упаўнаважаны па Гомельскай вобласці Юрый Назараў наведаў Петрыкаўскі раён, каб пракантраляваць ход мадэрнізацыі малочнатаварнага комплексу «Ляскавічы» ААТ «Агра-Ляскавічы». На адзначаным аб'екце вядзецца мадэрнізацыя па прыкладзе перадавога вопыту ААТ «Парахонскае» Пінскага раёна. Аляксандру Лукашэнку падрабязна далажылі аб планах мадэрнізацыі МТК. Кіраўнік дзяржавы даручыў паскорыцца з рэалізацыяй намечанага і адвёў тэрмін да новага года, папярэдзіўшы, што плануе асабіста ацаніць рэзультат.

Акрамя таго, падчас візіту Прэзідэнта ў Петрыкаўскі раён кіраўнік спраў Прэзідэнта Беларусі Юрый Назараў прапанаваў больш актыўна ўкараняць пры будаванні ў якасці перакрыццяў замест вырабаў з жалезабетону і металу ЛВЛ-брусы.

Асноўнай мэтай цяперашняга візіту кіраўніка спраў Прэзідэнта Юрыя Назарава на Петрыкаўшчыну якраз і стала інспектаванне ходу будаўнічых работ па мадэрнізацыі малочнатаварнага комплексу «Ляскавічы» ААТ «Агра-Ляскавічы».

Юрый Назараў азнаёміўся з ходам будаўніцтва на аб'екце малочна-дайльнага блока, двух кароўнікаў для ўтрымання дойнага статка і іншых дапаможных памяшканняў і збудаванняў. Акрамя таго, ён пацікавіўся захаваннем рабочага графіка ўзвядзення аб'ектаў, забяспечанасцю неабходнымі будаўнічымі матэрыяламі, вытворчасцю і тэхналогіяй узвядзення ЛВЛ-бруса.

Як было адзначана па выніках агляду аб'екта мадэрнізацыі, будаўнікі працуюць зладжана, пытанняў па ўзвядзенні аб'екта ў пазначаны тэрмін быць не павінна.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ВАЖНЫ ПАКАЗЧЫК НА ШЛЯХУ ВЫКАНАННЯ ДАРУЧЭННЯ

## Як аграрыі Брэстчыны выконваюць абяцанне губернатара кіраўніку дзяржавы

У аўторак Аляксандр Лукашэнка прымаў з дакладам старшыню Брэсцкага аблвыканкама Пятра Пархомчыка. Абмяркоўваўся ход палявых работ. На якім этапе ўборачная сёння, а таксама аб планах, што стаяць перад аграрыямі, карэспандэнту «Звязды» расказалі ў Брэсцкім аблвыканкаме.

Як паведаміла **начальнік аддзела вытворчасці прадукцыі раслінаводства і кормавытворчасці камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканкама Аксана ЛАШКЕВІЧ,** абяцанне, якое даў губернатар Брэстчыны Прэзідэнту (атрымаць сёлета больш за 2 мільёны 100 тысяч тон збожжавых і зернебабовых з улікам кукурузы і рапсу), будзе выканана: «На сённяшні дзень практычна завершана ўборка збожжавых і зернебабовых культур без уліку кукурузы. Таксама завяршаецца ўборка яравога рапсу, ужо ўбрана каля 91 % плошчаў. Аграрыі вобласці прыступілі і да ўборкі кукурузы на зерне. Сёння ўбрана 5 % плошчаў».

Адзначыла начальнік аддзела і добрую сярэднюю ўраджайнасць: «Сёння ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых складае 44,5 ц/га, што на 7,2 ц/га больш за ўзровень мінулага года. Усе раёны далі значную прыбаўку ва ўраджаі. Самую вялікую прыбаўку далі Драгічынскі і Іванаўскі раёны: 12,7 і 11,4 ц/га адпаведна». Аксана Лашкевіч таксама падкрэсліла, што сёлета ўпершыню Брэсцкая вобласць намалаціла 1,5 мільёна тон збожжа без уліку рапсу і кукурузы. Гаворка — аб збожжавых і зернебабовых. «Гэта важны паказчык на шляху выканання даручэння кіраўніка дзяржавы аб вытворчасці двух з паловай мільёнаў тон збожжа з улікам кукурузы і алейнага семя рапсу».

Карэспандэнт «Звязды» спытаўся таксама пра ход падрыхтоўкі да галоўнага свята хлебаробаў вобласці. «Сёлета абласныя «Дажынкі» пройдуць у Белаазёрску — горадзе энергетыкаў. Свята хлебаробаў — гэта заўсёды не толькі даніна павагі аграрыям і працавітым людзям нашай зямлі, але і маштабнае абнаўленне горада, дзе праходзіць фестываль», — паведамілі ў прэс-службе Брэсцкага аблвыканкама. (Падрабязна пра тое, як Белаазёрск рыхтуецца да свята, мы расказвалі ў мінулым нумары. «Мы бачым, што «Дажынкі» становяцца магутным штуршком для развіцця малых гарадоў. Пасля свята тут застаецца добраўпарадкаваны, камфортны, сучасны Белаазёрск — горад, дзе хочацца жыць, вучыцца, працаваць і гадаваць дзяцей», — адзначылі ў прэс-службе.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Слонимская камвольно-прядильная фабрика»

Аукцион состоится 08.10.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 450/С-20867 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – пилорама), площадью 344,9 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, 50/7;<br>- система пожарной сигнализации, г. в. 24.10.2012;<br>- трансформатор ТМТ-400/10, г. в. 01.06.1998.<br>ЛОТ № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 425450100001010263, площадью 0,4959 га, (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания пилорамы), расположенном по адресу: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним ул. Брестская, 50 корпус 7.<br>Обременений со стороны третьих лиц нет |
| **Условия проведения аукциона** | Вовлечение в хозяйственный оборот в течение двух лет с момента заключения договора купли-продажи |
| **Начальная цена продажи** | 88 744,56 руб. (восемьдесят восемь тысяч семьсот сорок четыре рубля пятьдесят шесть копеек) с учетом НДС |
| **Шаг аукциона** | 5 % |
| **Сумма задатка** | 8 874 руб. (восемь тысяч восемьсот семьдесят четыре рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 06.10.2025 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 28.05.2025 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |

## СТАЦЬ ЦЭНТРАМ ПРЫЦЯГНЕННЯ ДЛЯ ЎСЁЙ МОЛАДЗІ

ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ

### Такой бачыцца місія БРСМ

Грамадская арганізацыя «БРСМ» павінна стаць цэнтрам прыцягнення для ўсёй моладзі. Гэта падкрэсліў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ, выступаючы на 46-м з'ездзе арганізацыі.



«Нядаўна на сустрэчы Прэзідэнта нашай краіны з ідэалагічным актывам кіраўнік дзяржавы паставіў задачы для БРСМ. Акрамя патрыятычнага выхавання, гэта валанцёрства і будатрады», — адзначыў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Выконваючы гэтыя задачы, па словах Уладзіміра Пярцова, у шэрагі руху неабходна ўцягнуць усю моладзь, і перш за ўсё з дапамогай яе ўдзелу ў мерапрыемствах, якія будуць ёй цікавыя.

«Давайце вызначым, што БРСМ стане і асноўным аператарам працаўладкавання не толькі для членаў арганізацыі і не толькі ў летні і канікулярны перыяды, але і на працягу ўсяго года. Вы ведаеце, як гэта запатрабавана сярод маладых людзей. І не толькі для таго, каб зарабіць капейку, але і каб не трапіць у дэструктыўныя сеткі, у крымінальныя гісторыі. Арганізацыі патрэбныя новыя іміджавыя і запатрабаваныя сярод маладых людзей праекты, найперш з ідэалагічным сэнсам. БРСМ павінен стаць цэнтрам прыцягнення для ўсёй моладзі», — адзначыў Уладзімір Пярцоў.

У грамадскай арганізацыі работа павінна быць арганізавана так, каб кожны мог знайсці сябе, рэалізуючыся ў блогерстве, субкультуры, спартыўных спаборніцтвах, новых формах вольнага часу.

«Для прасоўвання ў Інтэрнэце маладзёжнага парадку дня неабходна выбудаваць эфектыўную работу з новымі і традыцыйнымі медыярэсурсамі. Кантэнт рабіце даступным, цікавым, а не толькі ў выглядзе самасправаздач у сацсетках. Паспрабуйце праз гэту работу ўцягнуць тых маладых хлопцаў і дзяўчат, якія пакуль яшчэ толькі чулі аб вашай арганізацыі. Звярніце ўвагу на першакурснікаў ВНУ і каледжаў, станьце для іх настаўнікамі, дапамагаючы адаптавацца ў новым для іх горадзе, сталіцы», — параіў маладзёжнаму актыву Уладзімір Пярцоў.

Таксама, на думку першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, не трэба пакідаць без увагі працоўную моладзь.

«У ВНУ або ў ССНУ маладыя людзі актыўныя, але, размяркоўваючыся на працу, часам губляюцца. Далей яны застаюцца практычна не задзейнічаныя ў палітычнай і грамадскай рабоце. Для эфектыўнай дзейнасці патрэбныя зацікаўленыя ў поспеху агульнай справы лідары, таму так важна фарміраванне дзейснага рэзерву кадраў — ад ЦК да пярвічак», — падкрэсліў Уладзімір Пярцоў, выказаўшы падзяку актывістам БРСМ за работу і ініцыятыву ў найважнейшых для краіны грамадска-палітычных кампаніях, за ўнёсак у рэалізацыю дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

**Паводле БелТА. Фота БелТА.**

### Дарэчы

На з'ездзе маладзёжны актыў Беларусі выбраў першым сакратаром Цэнтральнага камітэта БРСМ Уладзіміра Паўлоўскага. Аляксандр Лук'янаў, які да нядаўняга часу кіраваў арганізацыяй, цяпер узначальвае Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінскага гарвыканкама.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «МОГОТЕКС», г. Могилев, ул. Гришина, 87. УНП 700116054 |
| **Оператор / Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by)** |
| **Предмет электронного аукциона** (одним лотом)<br>Адрес: **Могилевская обл., г. Могилев, ул. Гришина, 87** | |
| **Здание подсобного хозяйства (свиноферма)**<br>(здание специализир. животноводства**, 1949,8 кв. м,** 700/С-50144), **асфальтированное покрытие свинофермы** (68 кв. м, 700/С-122311), **бетонное покрытие свинофермы** (550 кв. м, 700/С-122312), **сети водоснабжения свинофермы** (36 м, 700/С-122313), **чугунный канализационный трубопровод свинофермы** (6,5 м, 700/С-122314) | |
| ***Сведения о земельном участке*:** пл. 38.3773 га предоставлен на праве долевого постоянного пользования (доля: 119/125) для строительства и обслуживания зданий и сооружений.<br>После продажи земельный участок будет разделён в долях | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 321 340,17 бел. руб.**<br>Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) календарных дней** со дня завершения электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение 2 % от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 28.10.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.10.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, E-mail: auction@cpo.by** | |

ПА СУТНАСЦІ

## РЭЛІГІЯ ЗГОДЫ

Ва ўсе званы. Менавіта так Жыровіцкая абіцель сустракала кіраўніка дзяржавы. Напярэдадні важнага і першага ў царкоўным годзе праваслаўнага свята Раства Багародзіцы Аляксандр Лукашэнка наведаў манастыр, цэнтрам якога — не толькі архітэктурным — з'яўляецца сабор, асвечаны ў гонар Маці Божай.



Духоўны анклаў прыкметна змяніла рэстаўрацыя. Дапамагла дзяржава. Свецкі погляд на праваслаўную жамчужыну Беларусі — яна павінна мець годную агранку. Успенскі сабор — гэта праваслаўная святыня і здабытак Беларусі. Па меркаванні экспертаў, без рэстаўрацыі была небяспека разбурэння архітэктурнай жамчужыны, якая ўвасоблена адразу ў чатырох стылях, у тым ліку барока, ракако і класіцызм.

Жыровіцкая абіцель на нацыянальнай карце Беларусі — пункт сакральнай геаграфіі. Яна змяшчае ўвесь боль, надзеі і радасць гісторыі нашага народа. Яе зачынялі і перабудоўвалі, апускалі ў забыццё і ўзносілі на алтар дзяржаўнай увагі.

Гаворым аб развіцці манастырскага комплексу, маем на ўвазе ўвесь аграгарадок Жыровічы. Тут жывуць 2,5 тысячы чалавек, працуе вядомы ў краіне аграрна-тэхнічны каледж. Апрацоўваць хлебную ніву вучацца з відам на альма-матар сейбітаў духоўнасці. Моладзь у храме — сіла нацыянальнага духу.

Каля праваслаўнага алтара Аляксандр Лукашэнка гаворыць аб цэнтрах духоўнасці для кожнай канфесіі. Прэзідэнт — аўтар тэзіса «ў кожнага павінна быць дарога да храма». Часта ўсе канфесіі за адным сталом збіраюцца ў Палацы Незалежнасці. Такая сітуацыя вельмі кантрастуе з сусветным мэйнстрымам. У той час, калі адны цэнтры сіл спрабуюць дамінаваць за кошт рэлігійнага падзелу, Беларусь была і застаецца краінай міжканфесійнага дыскурсу.

Першы гатовы апярэдзіць магчымыя спрэчкі і непаразуменні і з дапамогай дзяржавы стварыць цэнтры сусветных рэлігій у краіне, каб нікога не пакрыўдзіць. Кіраўнік дзяржавы прапанаваў дэмакратычную справядлівасці: нягледзячы на колькасць вернікаў дапамагчы кожнай з канфесій стварыць свой цэнтр прыцягнення. У праваслаўных — гэта Жыровічы, у каталікоў — напрыклад, Будслаў. У яўрэяў наогул адукацыйная традыцыя цесна захавала памяць геаграфіі Беларусі. Валожын, Пінск, ці, напрыклад, Камянецкая іешыва, вядомая ўсяму іудзейскаму свету. У мусульман Іўе або Навагрудак, дзе вякамі жылі нашы беларускія татары.

У Жыровічах Аляксандр Лукашэнка наведаў магілу мітрапаліта Філарэта. З букетам белых руж, якія так любіў Уладыка. Менавіта першы Патрыяршы Экзарх Беларусі разам з Першым Прэзідэнтам стаялі каля вытокаў міжканфесійнага міру.

Грамадска-гістарычны мэйнстрым фармалізаваны дзяржаўнай палітыкай. У беларускіх сем'ях часта адзначаюць два Вялікадні. Як грамадская акцыя паходзіць малітва за Беларусь — калі за любімую краіну моляцца ў храмах усіх традыцыйных канфесій. Сакрэт такога рэлігійнага міру просты — найлепшыя рысы канфесій адбіваюцца і ў беларускім характары, і ў дзяржаўных падыходах.

На жаль, шмат дзе па-іншаму — рэлігію спрабуюцьператварыць у інструмент палітыкі і нават у поле бою за інтарэсы сваіх дзяржаў. Сур'ёзны выклік ужо кінуты. Чайлд-фры — гэта ментальная зброя тых, хто хоча знішчыць традыцыйны свет. Рэлігія — гэта стрыжань, хрыбет. Тыя, хто абвясціў вайну чалавеку, сям'і, дзяржаве, ствараюць сваю «рэлігію» — распусты і асалоды. Яна вядзе да пагібелі.

Важны момант канфесіянальнага адзінства — агульныя адносіны да абароны роднай краіны. Зусім не захопніцкая пазіцыя, а жаданне жыць у міры згуртавала ўсіх. І мы збіраемся за адным сталом, дзе ўсе абменьваюцца ўсмешкамі. Не дыпламатычнымі, а шчырымі.

Свецкая і духоўная ўлады ідуць поруч, а над Беларуссю гучыць не набат небяспекі, а звон-дабравест. І так хораша на душы!

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

ВЕКАПОМНАЕ

# АГУЛЬНЫЯ ВАЖНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

## Абноўлены канцэрт-рэквіем «Кожны трэці» паказалі ў Маскве



Канцэрт-рэквіем, які ў год 80-годдзя Вялікай Перамогі ўбачыла, без перабольшвання, уся Беларусь, паказалі ў Вялікай зале Крамлёўскага палаца. Шэсць тысяч гледачоў ушанавалі памяць кожнага трэцяга беларуса, хто загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны, разам з удзельнікамі мастацкай праграмы, якую склалі як вядомыя песні савецкага перыяду, так і сучасныя кампазіцыі, прысвечаныя ваеннай тэме.



Акрамя гэтага, у канцэрт уключаны ўнікальныя фотадакументы, архіўныя кадры. А паэтычнай асновай праграмы стаў «Рэквіем па кожным чацвёртым» Анатоля Вярцінскага. І гэты кранальны, праўдзівы, маштабны музычна-паэтычны аповед усім нам нагадвае пра боль, пакуты, страты ў эквіваленце людскіх пакут і цану, якую Беларусь заплаціла за Вялікую Перамогу і права жыць пад мірным небам вось ужо 80 гадоў, нікога не пакінуў і ў той вечар абыякавым.

«Праект вельмі значны і вельмі высакаякасны з пункту гледжання падрыхтоўкі артыста, рэжысёра і гэтак далей. Яшчэ больш значна, што гэтую тэму мы нясём у сабе і кожны трэці — гэта пра нас. Няма ніводнай беларускай сям'і, у якую гора Вялікай Айчыннай вайны не дайшло. Тое, што менавіта мы з'яўляемся такімі адданымі барацьбітамі за гістарычную праўду, не выпадковасць», — адзначыла ў размове з журналістамі **намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Наталля ПЯТКЕВІЧ.**

Віцэ-прэм'ер таксама выказала ўдзячнасць расійскаму боку за тое, што падтрымалі ідэю і зрабілі яе рэальнасцю: «Гэта эмацыянальна цяжкі праект. Для мяне, напрыклад, кожная ваенная песня — боль. Дзякуй Богу, што мы і пакаленне нашых бацькоў не былі сведкамі гэтага. Краіна, у якой мы жывём, помнікі вайны настолькі напоўнены ўспамінамі і адчуваннямі, што гэтая каштоўнасць Перамогі, свабоды, міру для нас набывае не проста кніжнае значэнне. Гэта тая каштоўнасць, якую мы павінны адстойваць і за якую павінны змагацца».

Варта адзначыць, што прэм'ера канцэрта адбылася летась таксама ў Маскве ў маі на Паклоннай гары. Але, як распавяла **галоўны рэжысёр канцэрта-рэквіема «Кожны трэці», мастацкі кіраўнік Маладзёжнага тэатра эстрады Уладзіслава АРЦЮКОЎСКАЯ**, у сёлетняй праграме з'явіліся і некаторыя змены: «Мы «Кожны чацвёрты» закрэсліваем і пішам «Кожны трэці». Штогод, калі не штодзень, праводзяцца расследаванні. Наша пракуратура іх праводзіць. Таму і кожны канцэрт адрозніваецца ўжо ўдакладненымі данымі». Паводле яе слоў, канцэрт у Крамлёўскім палацы якраз і паказвае самыя свежыя дакументальныя сведчанні аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Акрамя гэтага, сама пляцоўка дазволіла стваральнікам узмацніць дзеянне, далучыць большую колькасць людзей і ў выніку прадставіць гледачам маштабны аповед пра боль і жах, якія прынесла нашаму народу вайна, і пра нашу памяць аб гэтым.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота БелТА.**

НАША ПАЗІЦЫЯ

# КУРС НА РАЗВІЦЦЁ ШМАТПАЛЯРНАСЦІ І ШМАТБАКОВАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Аб чым Максім Рыжанкоў гаварыў на пляцоўцы ААН

Міністр замежных спраў Беларусі Максім Рыжанкоў выступіў на мерапрыемстве высокага ўзроўню па пытаннях Ініцыятывы глабальнага развіцця, якое было арганізавана кітайскім бокам у рамках 80-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у Нью-Ёрку.



Максім Рыжанкоў заявіў, што Ініцыятыва глабальнага развіцця, а таксама іншыя ініцыятывы, прапанаваныя ў апошнія гады Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам, — у сферах бяспекі, міжцывілізацыйнага дыялогу і глабальнага кіравання, — разам з ініцыятывай «Адзін пояс — адзін шлях» з'яўляюцца прыкладам адказнага сусветнага лідарства.

«Асабліва важна, што гэта лідарства выявілася ва ўмовах міжнароднай нестабільнасці і нявызначанасці, выкліканых крызісам заходняй ліберальнай сістэмы. Усе гэтыя ініцыятывы заснаваныя на разуменні: толькі сумеснымі намаганнямі, толькі праз фарміраванне супольнасці адзінага лёсу чалавецтва можна справіцца з глабальнымі выклікамі і закласці асновы справядлівага шматпалярнага свету», — падкрэсліў міністр.

Глабальная ініцыятыва ў сферы развіцця мае трывалы падмурак — уласны вопыт Кітая, у тым ліку поспехі ў вывадзе сотняў мільёнаў людзей з беднасці.

Маркуецца, што краіны, якія развіваюцца, атрымліваюць адчувальную карысць як ад гэтай ініцыятывы, так і ад іншых форм кітайскай падтрымкі.

«Беларусь з самага пачатку падтрымала глабальную ініцыятыву ў сферы развіцця. Мы ўвайшлі ў групу сяброў ініцыятывы і ў сетку цэнтраў садзейнічання глабальнаму развіццю. У пачатку 2023 года Беларусь і Кітай падпісалі мемарандум аб узаемаразуменні па яе рэалізацыі, і сёння мы ўжо працуем над канкрэтнымі сумеснымі праектамі», — расказаў міністр.

Максім Рыжанкоў дадаў, што Беларусь і Кітай паслядоўна выступаюць за шматпалярнасць, мір, развіццё і шматбаковае супрацоўніцтва.

«Беларусь працягне гэты курс, уносячы ўклад у рэалізацыю глабальных ініцыятыў Кітая і прасоўваючы ўласныя прапановы», — рэзюмаваў кіраўнік беларускага МЗС.

Ініцыятыва глабальнага развіцця была вылучана Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам у 2021 годзе на палях 76-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Яна накіравана на забеспячэнне рэалізацыі Парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года і прадугледжвае, што краіны павінны развіваць супрацоўніцтва ў адпаведнасці з прынцыпамі салідарнасці і ўзаемнай павагі, імкнучыся да ўзаемнай выгады.

У наступныя гады кітайскім бокам таксама былі сфармуляваны Ініцыятыва глабальнай бяспекі і глабальная цывілізацыйная ініцыятыва. Тры глабальныя ініцыятывы Кітая закладваюць прынцыпы, на падставе якіх КНР выбудоўвае сваю знешнюю палітыку ў цяперашні час.

**Паводле БелТА.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Потсдам» г. Лида, Гродненская обл., г. Лида, ул. Летная, 4 |
| **Оператор / Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Здание магазина «Остров»** (Здание специализированное розничной торговли), инв. № 420/С-4761, общ. пл. 451,7 кв. м по адресу: Гродненская обл., г. Лида, ул. 2-я Куйбышева, 3. Сост.части и прин-ти: терраса, две пристройки, сооружение благоустройства, канализационная сеть. В состав лота входит иное имущество, подробнее на **www.cpo.by.**
Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,1160 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания магазина

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 573 840,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** оплата предмета аукциона осуществляется победителем в порядке и сроки, предусмотренные договором купли-продажи, но не позднее 30 календарных дней со дня проведения аукциона, если иное не установлено указанным договором

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение и затраты за проведение независимой оценки продавцу, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.08.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 24.10.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **23.10.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

| Предметы торгов | Начальная цена, руб. (без учета НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** трактор колесный «Беларус-82.1», год выпуска 2005 г., регистрационный знак АВ-1 6014 | 13 300,00 | 1 330,00 |
| **Лот № 2:** погрузчик-экскаватор ТО-49, год выпуска 2006 г., регистрационный знак АА 7343 | 16 300,00 | 1 630,00 |
| **Лот № 3:** погрузчик ТО-18Б, год выпуска 2000 г., регистрационный знак АВ-1 9704 | 23 800,00 | 2 380,00 |
| **Лот № 4:** трактор гусеничный с бульдозерным оборудованием Б10М.0111.ЕН, год выпуска 2010 г., регистрационный знак АВ-1 7224 | 36 400,00 | 3 640,00 |

**Местонахождение объекта:** Брестская обл., г. Каменец, ул. 8 Марта, 17.
**Продавец:** ОАО «Каменецкий райагросервис», 225051, Брестская обл., г. Каменец, ул. 8 Марта, 17, тел. 80163123086.
**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления.
**Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901.
**Условия продажи:** без условий.
**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона.
**Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 28 октября 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 27 октября 2025 г. до 17.00**

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении открытого аукциона по продаже права заключения**
**ДОГОВОРА АРЕНДЫ ОТКРЫТОЙ ПЛОЩАДКИ С ПОКРЫТИЕМ**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **Открытое акционерное общество «Солигорскторг», г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44** |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **13.10.2025, 11.00, актовый зал ОАО «Солигорскторг»** |
| **Лот № 1** | |
| **Предмет аукциона** | **Право заключения договора аренды открытой площадки с покрытием** |
| **Общая площадь, кв. м** | 8,0 |
| **Местонахождение недвижимого имущества** | Минская область, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 63, район магазина № 35 |
| **Целевое использование имущества** | **Организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения нестационарного торгового объекта по реализации продуктов питания собственного производства** |
| **Условия аукциона** | До подачи заявления на участие в аукционе необходимо согласовать с начальником отдела архитектуры и строительства райисполкома (Макей С.В.) и (или) с отделом торговли и услуг райисполкома (Томка Т.С.) внешний вид, цветовое решение и рекламное оформление объекта; обеспечить функционирование объекта в соответствии с указанным целевым использованием; обеспечить содержание объекта и прилегающей территории в соответствии с санитарными нормами и правилами; обеспечить наличие документов, подтверждающих безопасность эксплуатации объекта согласно установленным правилам (при необходимости); обеспечить подключение объекта к источнику электроэнергии (при необходимости); обеспечить подвод воды и канализации к объекту в соответствии с санитарными нормами и правилами (при необходимости); установить контейнер и заключить договор со специализированным предприятием на вывоз мусора (при необходимости); установить биотуалет (при необходимости); обеспечить сохранность зеленой зоны в случае расположения объекта в непосредственной близости к ней; по истечении срока договора аренды открытой площадки с покрытием произвести демонтаж объекта и восстановить благоустройство, нарушенное за время работы объекта |
| **Начальная цена права заключения договора аренды объекта, руб.** | 37,54 |
| **Сумма задатка, руб.** | 37,54 |
| **Срок договора аренды** | 3 года |
| **Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы, устанавливаемый арендодателем или размер арендной платы** | 15 БАВ в месяц |
| **Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона в предусмотренных законодательством случаях, руб.** | 4 200,00 |

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44, финансовый отдел, с 8.00 до 15.00 по рабочим дням по 10 октября 2025 г. включительно, телефоны: 8 (0174) 26 07 31, 23 65 26.**
Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by (https://au.nca.by)**, Солигорского районного исполнительного комитета – **www.soligorsk.gov.by** (Главная/Экономика и бизнес/Инвестору/Аукционы), открытого акционерного общества «Солигорскторг» – **www.soligorsktorg.by** (Главная/Аукционы)



**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) – проводит электронные торги (оператор ЭТП – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638) по продаже **транспортных средств, бывших в употреблении** (местонахождение: г. Минск, ул. Машиностроителей, 13), принадлежащих **Национальному банку Республики Беларусь** (УНП 100665467):

| Лот № | Наименование | Начальная цена без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Легковой минивэн «Volkswagen Touran», 9496 МЕ-7**, 2010 г. в. | **17 856,00** |
| 2 | **Легковой минивэн «Volkswagen Touran», 1991 АВ-7**, 2010 г. в. | **18 150,00** |

С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by и оператора ЭТП **www.ipmtorgi.by**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 24.10.2025 с 11.00 до 11.10. Дата и время окончания приёма заявок:** принимаются по **23.10.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу

**Контактные телефоны:** +375 (17) 310-36-37, auction@cpo.by


# ГАЛОЎНАЕ, КАБ БЫЛА ІНІЦЫЯТЫВА

Год добраўпарадкавання 2025

## Наколькі актыўна ўцягнута насельніцтва цэнтральнага рэгіёна ў добраўпарадкаванне Мінскай вобласці?

Сёлета добраўпарадкаванню нададзены асаблівы статус: Указам Прэзідэнта Беларусі № 1 яно абвешчана ключавой тэмай года. У сувязі з гэтым усё больш актыўна прыводзяцца ў парадак тэрыторыі населеных пунктаў, сельскагаспадарчых аб'ектаў, дарог, ляснога фонду, садовых таварыстваў. Уладкоўваюцца зоны адпачынку і на водных аб'ектах. Як рэалізуецца ініцыятыва ў цэнтральным рэгіёне краіны і наколькі актыўны водгук яна знаходзіць у жыхароў Мінскай вобласці — у матэрыяле карэспандэнта «Звязды».

### ВЯЛІКІ ВОДГУК СЯРОД СЕЛЬСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА

На Міншчыне з моманту абвяшчэння Года добраўпарадкавання былі кансалідаваны сілы дэпутацкага корпуса, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, прадпрыемстваў, арганізацый і жыхароў, расказала **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай і арганізацыйна-прававой рабоце ГА «Жыллёва-камунальная гаспадарка Мінскай вобласці» Людміла ШМАРЛОЎСКАЯ.** Паводле яе слоў, моладзь таксама асабліва актыўна ўцягнута ў гэтыя працэсы, дзякуючы чаму сельскія населеныя пункты і аграгарадкі становяцца лепш з кожным днём. «Ініцыятыва Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі «На роднай зямлі жыві як гаспадар» знайшла вялікі водгук сярод сельскіх жыхароў. У Стаўбцоўскім раёне быў зняты сацыяльны ролік. Пасля яго выхаду жыхары актыўна дасылаюць фатаграфіі і відэа ў чат-бот, дзеляцца ўражаннямі, паказваючы, што становяцца ўсё больш ініцыятыўнымі і адказнымі за добраўпарадкаванне сваіх населеных пунктаў», — адзначыла Людміла Шмарлоўская.

У Мінскай вобласці ўдзяляецца вялікая ўвага падтрымцы пажылых людзей. Была запушчана акцыя «Квітней, родная Міншчына: твой уклад важны». Адным з кірункаў гэтай акцыі сталі маладзёжныя сацыяльныя суботнікі, у рамках якіх моладзь дапамагае наводзіць парадак на прыватных падворках адзінокіх пажылых людзей. Гэта ініцыятыва атрымала шырокую падтрымку як насельніцтва, так і грамадскіх арганізацый, адзначыла Людміла Шмарлоўская. «Галоўнае тут — менавіта ўвага і дапамога тым, хто ў гэтым сапраўды мае патрэбу», — падкрэсліла яна.

### ГРАМАДЗЯНСКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ ПА ДОБРАЎПАРАДКАВАННІ АТРЫМАЛІ НОВЫ ІМПУЛЬС

Паводле слоў **намесніка міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэя РАМАШКІ**, галоўная мэта Года добраўпарадкавання — кансалідацыя намаганняў усіх зацікаўленых бакоў. Найперш гэта землекарыстальнікі. «Калі мы гаворым аб добраўпарадкаванні, мы перш за ўсё гаворым аб парадку на зямлі, навядзенні парадку на ўчастках. Ключавы момант — зямля і землекарыстальнікі, размешчаныя на тэрыторыі краіны. Гэта прыватныя домаўладанні, прадпрыемствы розных форм уласнасці, арганізацыі, лясная і сельская гаспадаркі. Іншымі словамі, усе тэрыторыі, якія ў краіне занятыя пад пэўныя мэты», — патлумачыў намеснік міністра.

Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі стаіць на перадавой у рэалізацыі гэтых мерапрыемстваў, наколькі ацэньваюць працу ведамства грамадзяне, якія менавіта тут пражываюць. «Міністэрства адказвае за стан тэрыторый у населеных пунктах. Мы з'яўляемся драйверамі, задаём тэмп арганізацыі і рэалізацыі мерапрыемстваў у рамках Года добраўпарадкавання. У 2025-м выконваем тыя ж задачы, што і кожны год, але ва ўзмоцненым рэжыме, з павышанымі патрабаваннямі і мэтамі. Перад фарміраваннем планаў была праведзена дэталёвая інвентарызацыя ўсіх аб'ектаў: вулічна-дарожнай сеткі, жыллёвага фонду, аб'ектаў добраўпарадкавання і дзіцячых гульнявых пляцовак, — падкрэсліў Андрэй Рамашка. — Калі казаць пра шматкватэрныя дамы, то іх у краіне больш за 70 тысяч. Колькасць дзіцячых пляцовак вымяраецца дзясяткамі тысяч — практычна каля кожнага дома ёсць такая пляцоўка, і іх колькасць пастаянна расце. Мы таксама ўлічваем малыя архітэктурныя формы, спартыўныя і гульнявыя пляцоўкі».

Гаворка ідзе не толькі аб інфраструктуры прыдамавых тэрыторый, але і аб гарадской інфраструктуры ў цэлым: парках, скверах і розных грамадскіх лакацыях, якія сёння нярэдка ствараюцца з удзелам грамадзянскіх ініцыятыў. «Грамадзянскія ініцыятывы — гэта таксама вельмі цікавая і важная тэма, якая атрымала новы імпульс і развіццё», — адзначыў намеснік міністра.

### РЭАЛІЗУЕЦЦА 90 ГРАМАДЗЯНСКІХ ІНІЦЫЯТЫЎ ПА ДОБРАЎПАРАДКАВАННІ

Заявак падаецца больш, але існуе выразны рэгламент іх адбору, што вызначае, якія ініцыятывы могуць быць рэалізаваны, расказала **начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяна ЖАЛЯЗНОВА.** Разглядаюцца розныя праекты: устаноўка гульнявых пляцовак, азеляненне тэрыторый, рамонтныя работы. Грамадзяне могуць звярнуцца са сваімі ініцыятывамі па добраўпарадкаванні ў мясцовыя органы ўлады і паўдзельнічаць у конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў. Калі праект перамагае, то дзяржава аплаціць 90 % кошту працы па добраўпарадкаванні. Пры гэтым ёсць прыклады, калі людзі гатовыя былі ўнесці значна большую долю.

«Нядаўна ў вёсцы Маркаўшчына Мінскай вобласці была рэалізавана ініцыятыва аб спартыўнай пляцоўцы. Грамадзяне аб'ядналіся, каб рэалізаваць гэту ідэю, і, што асабліва важна, — ні ў адным выпадку ім не было адмоўлена. Усё было хутка арганізавана: падключыліся і лягасы, і мясцовыя органы ўлады, і Саветы дэпутатаў, якія выступілі каардынатарамі праекта, — паведаміла Таццяна Жалязнова. — Людзі не проста збіраюцца і просяць — яны самі актыўна ўдзельнічаюць у рэалізацыі. Пляцоўка ўжо зроблена і функцыянуе».

Галоўнае, каб была ініцыятыва. Пры гэтым грамадзяне бяруць на сябе адказнасць і за захаванасць і ўтрыманне аб'екта, каб ён заўсёды быў у добрым стане. І такія ініцыятывы заўсёды атрымліваюць падтрымку з боку ўлад і партнёраў. Таццяна Жалязнова дадала, што сёлета ўпершыню зацверджаны рэгіянальныя графікі і планы мерапрыемстваў, згодна з якімі будзе добраўпарадкавана больш за 150 знакавых аб'ектаў па ўсёй Беларусі. «Ужо добраўпарадкаваны 91 такі аб'ект. Гэта воінскія пахаванні, сацыяльна значныя ўстановы: школы, бальніцы, дзе ўсталёўваецца новае абсталяванне, ствараюцца рэнтген-кабінеты і сучасныя навучальныя памяшканні», — адзначыла яна.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**





# НА КАРЫСЦЬ ЗДАРОЎЯ

## Прамыя кантакты спрыяюць выбудоўванню новых кааперацыйных сувязяў прадпрыемстваў Беларусі і Кітая

Пра гэта заявіла намеснік міністра эканомікі Алеся АБРАМЕНКА на адкрыцці выстаўкі Кітайскага медыцынскага абсталявання ў індустрыяльным парку «Вялікі камень», паведамілі ў прэс-службе ведамства.

У сваім прывітальным слове намеснік міністра эканомікі адзначыла, што беларускія вытворцы і спажыўцы даўно разглядаюць Кітай як найважнейшага пастаўшчыка абсталявання, тэхналогій і матэрыялаў, і выказала ўпэўненасць, што прадпрыемствы-ўдзельнікі змогуць выбудаваць эфектыўныя каналы закупак і кааперацыйныя сувязі.

— У рамках нядаўняй сустрэчы на палях саміту Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва лідары Беларусі і Кітая пацвердзілі адзінства поглядаў па ключавых пытаннях міжнароднага і двухбаковага парадку дня. На аснове дасягнутых дамоўленасцяў мы працягнем паслядоўную рэалізацыю новай мадэлі прыкладнога супрацоўніцтва — стратэгіі сумеснага тэхналагічнага развіцця і прамысловай і інвестыцыйнай кааперацыі, — заявіла Алеся Абраменка.

У рамках адкрыцця выстаўкі адбыліся цырымоніі адкрыцця кітайска-беларускага цэнтра традыцыйнай кітайскай медыцыны, перадачы абсталявання Кітайскай асацыяцыяй медыцынскага абсталявання ў дар Мінскай абласной клінічнай бальніцы, а таксама падпісання Мемарандума аб супрацоўніцтве ў галіне ўралагічнай хірургіі.

# ПРАФЕСІЙНА АБ ІНТЭГРАЦЫІ

## Новы праект ад Мінэканомікі раскажа, чым жыве ЕАЭС

Міністэрства эканомікі ў рамках мерапрыемстваў, прымеркаваных да года беларускага старшынства ў органах ЕАЭС, запусціла штотыднёвую рубрыку — «Беларусы ў ЕЭК: прафесійна аб інтэграцыі», паведамілі ў прэс-службе ведамства.

Новы праект дае ўнікальную магчымасць даведацца непасрэдна ад міністраў і кіраўнікоў падраздзяленняў Еўразійскай эканамічнай камісіі аб тым, чым жыве ЕАЭС, што дало 10-гадовае функцыянаванне дзяржавам-членам і якія выклікі стаяць перад саюзам сёння.

Каб задаць пытанне, трэба адправіць яго на электронную пошту press@economy.gov.by з пазнакай «Беларусы ў ЕЭК». Найбольш цікавыя і актуальныя будуць адрасаваныя спікерам. Усе выпускі будуць публікавацца на YouTube-канале Мінэканомікі, а спасылкі — на афіцыйным сайце і ў тэлеграм-канале ведамства. Чакаецца, што першы выпуск выйдзе 8 кастрычніка.

Адкрые рубрыку міністр па тэхнічным рэгуляванні ЕЭК Валянцін Татарыцкі з тэмай «Тэхнічнае рэгуляванне як аснова для фарміравання адзінага рынку тавараў ЕАЭС».

У Мінэканомікі акцэнтавалі ўвагу на тым, што рубрыка будзе карысная эканамістам, аналітыкам, выкладчыкам, студэнтам, дзяржслужачым, спецыялістам у сферах знешняга гандлю, закупак, падаткаў і мытні, дыпламатам і журналістам — усім, хто цікавіцца інтэграцыяй, геаэканомікай і міжнародным правам.

*Пытанні можна дасылаць да 1 кастрычніка.*

# СТВАРЫЦЬ ТРЫВАЛУЮ АСНОВУ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ

## Юрый ЧАБАТАР і Максім РАШЭТНІКАЎ абмеркавалі далейшую стратэгію ўзаемадзеяння Беларусі і Расіі на інтэграцыйным трэку

Галоўнай тэмай сустрэчы міністра эканомікі Беларусі Юрыя Чабатара з міністрам эканамічнага развіцця Расіі Максімам Рашэтнікавым стала фарміраванне архітэктуры стратэгічнага ўзаемадзеяння, якая ахоплівае ўсе ключавыя сферы.

Бакі абмеркавалі асноўныя напрамкі гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва, падыходы да прагназавання сацыяльна-эканамічнага развіцця, а таксама шэраг іншых пытанняў, паведамілі ў прэс-службе Мінэканомікі.

На думку Юрыя Чабатара, ва ўмовах знешняй нявызначанасці ўстойлівасць нашых эканомік напрамую залежыць ад здольнасці гнутка і эфектыўна рэагаваць на выклікі.

— Сёння Беларусь сумесна з расійскімі партнёрамі фарміруе архітэктуру стратэгічнага ўзаемадзеяння, якая ахоплівае ўсе ключавыя сферы. Наша мэта — стварыць трывалую аснову для ўстойлівага і паступальнага развіцця. Над гэтым актыўна працуюць каманды міністэрстваў, фарміруючы выніковы прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця Саюзнай дзяржавы на найбліжэйшыя тры гады, — адзначыў міністр эканомікі.

Не менш важны пункт парадку дня — праект эканамічнай мадэлі Саюзнай дзяржавы на 2027—2030 гады, каардынатарамі работы над якой таксама выступаюць эканамічныя ведамствы дзвюх краін. Дакумент канкрэтызуе сферы двухбаковага супрацоўніцтва, якія дадуць дадатковыя эфекты ад саюзнай інтэграцыі.

Асаблівую ўвагу кіраўнікі міністэрстваў удзялілі развіццю турыстычнай галіны. Абмяркоўваліся практычныя крокі па стымуляванні далейшага росту ўзаемнага турпатоку.

— Узаемны турыстычны паток з года ў год павялічваецца. У 2024 годзе Беларусь прыняла больш за 350 тысяч расійскіх турыстаў, што на 59 % больш, чым у 2023-м. Расце цікавасць беларускіх грамадзян да падарожжаў па Расіі: турпаток павялічыўся на 78 % у параўнанні з 2023 годам. Гэта пацвярджае высокі патэнцыял галіны, і мы бачым вялікія перспектывы ў стварэнні сумесных турыстычных брэндаў і маршрутаў, — адзначыў Юрый Чабатар.

Максім Рашэтнікаў падкрэсліў важнасць стварэння турыстычнага інфармацыйнага цэнтра Саюзнай дзяржавы ў Смаленскай вобласці:

— Цэнтр дазволіць нам зладжана развіваць турыстычны патэнцыял Саюзнай дзяржавы, спрыяючы стварэнню «саюзнага» турпрадукту і яго прасоўванню.

Па выніках сустрэчы дасягнута дамоўленасць аб правядзенні чарговага сумеснага пасяджэння калегій міністэрстваў у кастрычніку — лістападзе бягучага года, дзе агучаныя тэмы будуць абмеркаваны больш дэталёва, з акцэнтам на канкрэтных мерах па ўмацаванні ўзаемадзеяння.

# БЕЛАРУСКАЕ — ЗНАЧЫЦЬ ЛЕПШАЕ

## Прадпрыемствы Мінпрама ў першым паўгоддзі амаль на чвэрць павялічылі экспарт у краіны далёкай дугі

Прадпрыемствы сістэмы Міністэрства прамысловасці Беларусі ў студзені – чэрвені бягучага года павялічылі аб'ём экспарту ў краіны далёкай дугі на 23,6 % да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года, паведамілі ў прэс-службе ведамства.

Назіраецца рост экспартных паставак у такія краіны, як Нікарагуа (у 25 разоў), Зімбабвэ (у 131 раз), Кітай (на 12,3 %), Марока (у 4,9 раза).

У цэлым экспарт у краіны Афрыкі вырас у 1,3 раза, у Азію — на 12,8 %.

У ведамстве таксама звярнулі ўвагу, што выраслі пастаўкі ў Азербайджан — на 9,3 %, Кыргызстан — у 2,1 раза.

***— У рамках стратэгічнага курсу на пашырэнне міжнародных сувязяў і ўмацаванне прамысловага патэнцыялу прадпрыемствы сістэмы Мінпрама актыўна развіваюць двухбаковае супрацоўніцтва з краінамі далёкай дугі, — адзначылі ў Мінпраме.***

У прыватнасці, прадпрыемствы галіны прапануюць інавацыйныя рашэнні ў галіне машынабудавання, металургіі і іншых ключавых галін, умацоўваючы пазіцыі на новых рынках.

Акрамя таго, Міністэрства прамысловасці Беларусі сумесна з прадпрыемствамі Мінпрама рэалізуе шэраг ініцыятыў па стымуляванні двухбаковых сувязяў: правядзенне бізнес-місій, удзел у міжнародных выставах, стварэнне сумесных прадпрыемстваў і іншыя.




***— Такім чынам, гэты трэнд адкрывае новыя магчымасці для абмену тэхналогіямі, інвестыцый і сумесных праектаў, спрыяючы развіццю эканомікі і павышэнню канкурэнтаздольнасці на глабальным рынку, — падкрэслілі ў ведамстве.***



# РУХ І РАЗВІЦЦЁ

## Аб'ём інвестыцый у асноўны капітал на прадпрыемствах Мінпрама вырас больш чым на 20 %

Аб'ём інвестыцый у асноўны капітал на прадпрыемствах сістэмы Міністэрства прамысловасці Беларусі за студзень – ліпень бягучага года ў супастаўных умовах большы чым на 22 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, паведамілі ў ведамстве.

Тут растлумачылі, што ў арганізацыях сістэмы Міністэрства прамысловасці на пастаяннай аснове вядзецца планамерная работа па абнаўленні асноўных вытворчых фондаў. Так, ажыццяўляецца рэалізацыя інвестыцыйных і інавацыйных праектаў, рэалізуюцца штогадовыя планы тэхнічнага пераўзбраення і мадэрнізацыі дзеючых вытворчых магутнасцяў.

— Асноўныя аб'ёмы інвестыцый накіраваны на набыццё машын, абсталявання, транспартных сродкаў, гэта значыць у актыўную частку асноўных фондаў, у суме 834 мільёны рублёў, — пракаментавалі ў ведамстве.

Па прагнозах, у цэлым па 2025 годзе па Мінпраме плануецца прыцягнуць больш за два мільярды інвестыцый у асноўны капітал.

Дарэчы, за 2021-2024 гады арганізацыямі сістэмы Мінпрама ўжо прыцягнута каля 3,96 мільярда рублёў інвестыцый.

— З улікам асваення інвестыцый бягучага года па выніках 2021-2025 гадоў плануецца выйсці на 6 мільярдаў рублёў інвестыцый, — агучылі прагноз у профільным міністэрстве. — Пры гэтым сумарны тэмп росту інвестыцый за названы перыяд складзе каля 286 % пры заданні, устаноўленым Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця ў цэлым па краіне — 121,6 %.

У ведамстве дадалі, што інвестыцыйная дзейнасць ажыццяўляецца, у тым ліку ў рамках рэалізацыі інвестыцыйных і інавацыйных праектаў, уключаны такія пералікі, як: ініцыятыва «Адзін раён — адзін праект», вытворчыя імпартазамяшчальныя інвестыцыйныя праекты, праекты па стварэнні новых вытворчасцяў, якія маюць вызначальнае значэнне для інавацыйнага развіцця Беларусі, пералік перспектыўных імпартазамяшчальных інвестыцыйных праектаў, што рэалізуюцца сумесна з калегамі з Расійскай Федэрацыі.

# З КЛОПАТАМ ПРА РОДНЫХ І БЛІЗКІХ

## Банк развіцця запусціў крэдыт для бізнесу ў сферы сацпаслуг з пражываннем

У пачатку жніўня ў Банку развіцця адбылася сустрэча кіраўніцтва фінансавага інстытута і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны з прадстаўнікамі бізнесу ў сферы сацыяльных паслуг з пражываннем. Лейтматывам дыялогу стала патрэба насельніцтва ў пансіянатах з якасным абслугоўваннем людзей, якія маюць патрэбу ў кругласутачнай дапамозе.

Кансалідаваўшы ідэі і прапановы бізнес-супольнасці, які заняты ў такой важнай для краіны сферы, і пачуўшы пазіцыю рэгулятара, Банку развіцця спатрэбілася крыху больш за месяц, каб вывучыць спецыфіку і распрацаваць спецыяльны крэдытны прадукт для МСП «Падтрымка аказання сацыяльных паслуг насельніцтву», паведамілі ў фінансавай установе.

Начальнік упраўлення падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Банка развіцця Юлія Русая расказала, што адметнай асаблівасцю дзейнасці прыватных сацыяльных пансіянатаў з'яўляецца іх размяшчэнне. Як правіла, яны знаходзяцца ў капітальных будынках або аднакватэрных жылых дамах, у тым ліку арандаваных памяшканнях.

— Асноўныя цяжкасці пры рэалізацыі гэтага бізнесу звязаны з фінансаваннем памяшканняў, выдаткамі на правядзенне рамонтных работ і закупку абсталявання, а таксама з атрыманнем доўгатэрміновых крэдытных рэсурсаў. Новы фінансавы інструмент Банка развіцця якраз і арыентаваны на поўнае задавальненне дадзеных патрэб, — адзначыла Юлія Русая.

Атрымаць крэдытныя рэсурсы прадпрымальнікі могуць у банках-партнёрах на тэрмін да 7 гадоў, а іх кошт складае 0,5 стаўкі рэфінансавання, павялічанай на 2,5 %. Сёння гэта 7,38 % гадавых.

Крэдытны прадукт даступны выключна прадпрымальнікам, якія аказваюць сацыяльныя паслугі з пражываннем. Пры гэтым абавязковай умовай з'яўляецца наяўнасць ліцэнзіі або яе атрыманне на працягу года з моманту прадастаўлення фінансавання.

— Банк развіцця пастаянна актуалізуе ўмовы фінансавання пад патрэбы розных галін эканомікі. У дадзеным выпадку са з'яўленнем выгаднага для бізнесу крэдытнага прадукту «Падтрымка аказання сацыяльных паслуг насельніцтву» банк спрыяе вырашэнню пастаўленай на ўзроўні дзяржавы задачы па павелічэнні колькасці прадпрымальнікаў у сістэме сацабслугоўвання і павышэнню якасці паслуг, — рэзюмавалі ў фінансавай установе.

# РАЗУМНЫ ВЫБАР

## Красоверы BELGEE ў Расіі прызнаныя найлепшымі на прэміі «Пазадарожнік года 2025»

Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Мінпрама. 18 верасня 2025 года сталі вядомыя пераможцы штогадовай прэміі «Пазадарожнік года».

Урачыстая цырымонія падвяла вынік галасавання экспертнага і народнага журы, адзначыўшы самыя запатрабаваныя мадэлі пазадарожнікаў, красовераў і пікапаў, прадстаўленых на расійскім рынку.

BELGEE X50, на думку спажыўцоў, прызнаны найлепшым у намінацыі «Монапрывадныя красоверы, кампактны сегмент», а BELGEE X70 атрымаў спецыяльную прэмію «Разумны выбар» — за найлепшыя суадносіны кошту і характарыстык.



PRO ЭКАНОМІКУ

# СУСВЕТНАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ (Р)ЭВАЛЮЦЫЯ

## Прычына канфрантацыі — раздзел дабаўленай вартасці ў глабальным вымярэнні

Падаплёка міжнароднай канфрантацыі, якая ўсё паглыбляецца, — крызіс класічнага капіталізму. Ён даўно адчуваецца на нацыянальным узроўні, а цяпер праяўляецца на глабальным.



Па сутнасці, эканамічныя спрэчкі і войны кружацца вакол аднаго і таго ж пытання: размеркавання сусветнай дабаўленай вартасці. Глабалізацыя падзяліла планету на рэгіёны з рознай спецыялізацыяй: сыравінныя, з высокімі паказчыкамі працоўных рэсурсаў, прамысловым патэнцыялам і высокім тэхналагічным развіццём. Буйныя дзяржавы і макрарэгіёны, па сутнасці, не могуць забяспечыць усе чатыры фактары. Таму эканамічнае супрацоўніцтва непазбежна. З іншага боку, востра стаіць пытанне аб падзеле прыбытку ад гэтага ўзаемадзеяння. Класічная схема капіталізму — «цэнтр — перыферыя» не працуе. А новай формулы пакуль няма. Пратэкцыянізм усіх відаў і масцяў, гандлёвыя войны, бар'еры ў выглядзе стандартаў і ўмоў доступу на рынак і іншы інструментарый — гэта фактычна зброя сусветнай эканамічнай рэвалюцыі. Лідары мінулай эпохі імкнуцца захаваць свой статус і яго ўмацаваць, іншыя рэгіёны не хочуць з'яўляцца другараднымі.

Велізарная заслуга Карла Маркса, што ён першым ва ўсіх падрабязнасцях вывучыў капіталізм і апісаў механізмы яго функцыянавання. Розныя сацыялістычныя плыні скарысталіся гэтымі ведамі і паклалі іх у аснову сваіх разнастайных эканамічных мадэляў. Калі ісці па класіцы, то вылучаецца тры фактары вытворчасці: **капітал, праца і зямля**. У нашым стагоддзі дадаўся яшчэ чацвёрты элемент — **інфармацыя**, пад якой разумеецца шырокі спектр ведаў: ад навуковых адкрыццяў да даных аб рынках і спажыўцах.



Велізарная заслуга Карла Маркса ў тым, што ён першым ва ўсіх падрабязнасцях вывучыў капіталізм і апісаў механізмы яго функцыянавання. Калі ісці па класіцы, то вылучаецца тры фактары вытворчасці: капітал, праца і зямля. У нашым стагоддзі дадаўся яшчэ чацвёрты элемент — інфармацыя

Ключавая супярэчнасць нашай эпохі, мабыць, — у тым, што ні адна краіна, нават самая вялікая і багатая, не можа ў належнай ступені забяспечыць усе чатыры фактары. У лепшым выпадку толькі тры. У **ЗША** ёсць прыродныя рэсурсы, тэхналогіі і капітал. Але катастрафічна не хапае работнікаў. Зрэшты, іх дэфіцыт меў месца і ў мінулыя стагоддзі. Але недахоп папаўняецца за кошт міграцыйных хваль, якія сёння спрабуюць знізіць. Адна адміністрацыя — у большай ступені, іншая — у меншай. Але да сябе, як у пачатку XX стагоддзя, усіх жадаючых ужо не запрашаюць. І міграцыйнае заканадаўства толькі ўскладняецца і губляе прыязнасць да грамадзян іншых рэгіёнаў. Дональд Трамп і ў першы, і ў другі свой тэрмін прыкладае неймаверныя намаганні для рэіндустрыялізацыі Штатаў. Але натыкаецца на адсутнасць рабочых, каб выпускаць задуманыя ім аб'ёмы тавараў на сваёй тэрыторыі. Менавіта з гэтай прычыны тарыфныя войны падымаюць шмат інфармацыйнага шуму, але насамрэч не заканчваюцца значнымі наступствамі. Спачатку ўводзяцца драконаўскія тарыфы, а потым праз выключэнні яны зводзяцца амаль на нішто. Таму што занадта шмат прадукцыі для амерыканскага рынку выпрацоўваецца ў тым жа Кітаі і Індыі. Іншае пытанне, што праз павышэнне тарыфаў Белы дом спрабуе выключыць на сваю карысць частку дабаўленай вартасці, якая дастаецца краінам-вытворцам. Іншымі словамі, пытанне перагавораў зводзіцца фактычна да таго, як будзе размяркоўвацца маржа паміж вытворцам і пакупніком. Вакол гэтага факта і круціцца ўся тарыфная палітыка.

**У Еўропе** з працоўнымі рэсурсамі трохі лепей, чым у ЗША. Але таксама ёсць вялікія праблемы. Акрамя таго, Стары Свет адчувае дэфіцыт у частцы рэсурснай базы. **У Кітаі** дастаткова працоўных рэсурсаў, як і ў **Індыі**. Але не хапае прыродных рэсурсаў. Акрамя таго, хоць гэтыя дзяржавы актыўна развіваюць тэхналогіі і інавацыі, але пакуль не дамагліся безумоўнага лідарства. **Афрыка** — адзін з нямногіх рэгіёнаў на планеце са станоўчай дэмаграфіяй. Там шмат свабоднай зямлі і велізарная колькасць карысных выкапняў. Але няма ні капіталу, ні тэхналогій. А калі такія з'яўляюцца, то валодаюць замежным паходжаннем.

І да пары да часу здавалася: гэта нармальная гісторыя. Глабалізацыя прадугледжвае падзел працы і спецыялізацыю. Адны здабываюць карысныя выкапні, іншыя іх перапрацоўваюць, трэція распрацоўваюць тэхналогіі і вырабляюць абсталяванне. Гэтакая вялікая **сусветная мануфактура**. Зноў жа, з класічным капіталістычным ланцужком «цэнтр — перыферыя». Не будзем хітраваць: глабалізацыя з'яўлялася эфектыўнай канструкцыяй з пункту гледжання павышэння эканамічнай эфектыўнасці. І бенефіцыярамі з'яўляліся ўсе краіны. Іншае пытанне, што цэнтр атрымліваў выгод значна больш, чым ускраіны. Адпаведна, канфлікт быў непазбежны. У XIX — пачатку XX стагоддзя рэвалюцыйныя рухі сацыялістычнага толку захапілі практычна ўсе дзяржавы. Пытанне справядлівай прапорцыі падзелу дабаўленай вартасці паміж усімі фактарамі вытворчасці стала рубам, паламаўшы і трансфармаваўшы ўсю палітычную сістэму.

Глабалізацыя па сваёй сутнасці развівалася па капіталістычных законах. У ёй удзельнічалі краіны з розным сацыяльна-эканамічным кіраваннем, але на міжнародным узроўні дзейнічалі хутчэй капіталістычныя прынцыпы. І крызіс сістэмы ў пэўны момант быў, мабыць, наканаваны і непазбежны. І цяпер кожная краіна і рэгіён спрабуюць стаць максімальна самастойнымі. Паняцце «эканамічная бяспека» сёння пераважае над эканамічнай або фінансавай выгадай. З пункту гледжання эфектыўнасці рэгіяналізацыі — адкат назад. Але за кошт павышэння сваёй лакалізацыі кожная дзяржава і рэгіён спрабуюць заняць больш выгадную пазіцыю нават не ў новай, а ў будучай рэальнасці і нармальнасці. Падазраю, што яна будзе зусім іншай. І глабалізацыя не знікне, але трансфармуецца. Іншае пытанне — на якіх канцэптуальных асновах? І яно, відаць, самае цікавае. Ідэалогія глабалізацыі мінулага стагоддзя ўжо сябе зжыла. Хоць бы па той прычыне, што рэалізоўвалася ва ўмовах лішку працоўных рэсурсаў, актыўнай распрацоўкі рэсурсаў. Цяпер, аб'ектыўна, на экстэнсіўнае развіццё няма ні чалавечага капіталу ў рамках планеты (насельніцтва старэе), ні прыродных багаццяў (каб усіх зрабіць заможнымі, як залаты мільярд), накладвае сваё абмежаванне і экалагічны складнік. Рана ці позна глабальны эканамічны канфлікт скончыцца выпрацоўкай новай канфігурацыі. І трэба ўжо прагледзець яе контуры. Зыходзячы з рэалій жыцця, а не амбіцый асобных краін і рэгіёнаў.

**Рана ці позна глабальны эканамічны канфлікт скончыцца выпрацоўкай новай канфігурацыі. І трэба ўжо прагледзець яе контуры. Зыходзячы з рэалій жыцця, а не амбіцый асобных краін і рэгіёнаў.**

**Аляксей КЛІМАЎ.**

### А ШТО Ў СВЕЦЕ?

У ЗША ёсць прыродныя рэсурсы, тэхналогіі і капітал. Але катастрафічна не хапае работнікаў.

У Еўропе з працоўнымі рэсурсамі трохі лепей, чым у ЗША. Але таксама ёсць вялікія праблемы. Акрамя таго, Стары Свет адчувае дэфіцыт у частцы рэсурснай базы.

У Кітаі дастаткова працоўных рэсурсаў, як і ў Індыі. Але не хапае прыродных рэсурсаў.

Афрыка — адзін з нямногіх рэгіёнаў на планеце са станоўчай дэмаграфіяй. Там шмат свабоднай зямлі і велізарная колькасць карысных выкапняў. Але няма ні капіталу, ні тэхналогій. А калі такія з'яўляюцца, то валодаюць замежным паходжаннем.

# ШТО ЗАМЕСТ BR?

## Зменіцца графічнае пазначэнне беларускага рубля



Нацбанк аб'явіў конкурс на новы графічны знак беларускага рубля. Мэта — стварыць арыгінальны і вядомы сімвал афіцыйнай грашовай адзінкі нашай краіны. За перамогу ў конкурсе прадугледжана ўзнагарода ў памеры 3000 беларускіх рублёў.

Як адзначыў намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Андрэй КАРТУН, роўна 20 гадоў таму Нацыянальны банк прыняў рашэнне аб выбары графічнага сімвала. Гэты графічны сімвал дзейнічае і цяпер у выглядзе дзвюх літар на лацінцы — Br. «Але прайшло некалькі дзесяцігоддзяў і мы ўбачылі, што гэты знак ніяк не прыжыўся ў насельніцтва. Да таго ж, за гэты час некалькі разоў адбывалася дэнамінацыя. З гэтых прычын і было прынята рашэнне абвясціць адпаведны конкурс. Менавіта такім чынам 20 гадоў таму выбіраўся графічны знак. Сёння мы бачым, што ў гэтым ёсць неабходнасць», — сказаў Андрэй Картун.

Ён удакладніў, што сімвалам павінна быць адна літара на лацінцы, і гэты знак будзе зразумелы ўсёй міжнароднай супольнасці і будзе атаясамляцца менавіта з беларускім рублём. «Мы цяпер бачым, што практычна ўсе краіны свету выкарыстоўваюць менавіта адзін сімвал. Напрыклад, долары, еўра, расійскія рублі», — адзначыў намеснік старшыні праўлення Нацбанка.

Удзел у конкурсе могуць прыняць грамадзяне нашай краіны, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Беларусі. Кожны ўдзельнік як індывідуальна, так і ў складзе калектыву аўтараў можа прадставіць на конкурс некалькі работ. Для ўдзелу ў конкурсе ўсе жадаючыя павінны не пазней 7 лістапада гэтага года даслаць на адрас электроннай пошты grafznak@nbrb.by з пазнакай «графічны знак» заяўку на ўдзел у конкурсе; сваю конкурсную працу, а таксама яе кароткае апісанне з аўтарскай трактоўкай сэнсу і зместу (ідэя, мэта і абазначэнне элементаў); згоду на апрацоўку персанальных даных.

**Для ўдзелу ў конкурсе ўсе жадаючыя павінны не пазней 7 лістапада гэтага года даслаць на адрас электроннай пошты grafznak@nbrb.by з пазнакай «графічны знак» заяўку на ўдзел у конкурсе; сваю конкурсную працу, а таксама яе кароткае апісанне з аўтарскай трактоўкай сэнсу і зместу (ідэя, мэта і абазначэнне элементаў); згоду на апрацоўку персанальных даных.**

Андрэй Картун адзначыў, што існуе некалькі патрабаванняў да конкурсных работ. Эскізны праект графічнага знака павінен быць кароткім, спецыфічным (унікальным), простым, універсальным, захоўваць свой знешні выгляд нават пры змене памеру і ў чорна-белым выкананні. Акрамя гэтага, канцэпцыя сімвала графічнага знака павінна ўтрымліваць аўтарскую трактоўку яго сэнсу і зместу (ідэя, абазначэнне, мэта распрацаваных элементаў).

Графічны знак павінен атаясамляцца з назвай афіцыйнай грашовай адзінкі нашай краіны — беларускага рубля, напісанне графічнага знака па магчымасці павінна грунтавацца на кірыліцы. Але, у той жа час, вітаецца свабода творчасці, таму эскізны праект графічнага знака выконваецца ў адвольнай форме, можа быць прадстаўлены ў каляровым выглядзе ў графічным або вектарным фармаце.

Конкурс праводзіцца ў два этапы: адборачны і заключны. На адборачным этапе конкурсу, які праводзіцца Нацыянальным банкам з 7 да 16 лістапада (уключна), унікальная камісія ажыццяўляе ацэнку адпаведнасці прадстаўленых конкурсных работ умовам конкурсу, вызначае (адбірае) не больш за пяць конкурсных работ для ўдзелу ў заключным этапе.

Характэрна, што лепшыя работы адбярэ камісія, а фінальнага пераможца дапамогуць выбраць усе жадаючыя шляхам адкрытага галасавання на сайце Нацбанка з 17 да 28 лістапада. Вынікі будуць агучаны да 31 снежня. А прачнёмся ў новым годзе з новым графічным знакам нашага роднага рубля.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА

# СКЛАДНІКІ БАГАТАГА СТАЛА

## Што будзе ў рацыёне беларусаў?

З рэкорднымі паказчыкамі завяршаецца ўборка асноўных сельскагаспадарчых культур. Гэта перыяд значны і адказны, паколькі звязаны з забеспячэннем харчовай бяспекі, лічыць намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі Святлана КАНДРАЦЕНКА.



Яна падкрэсліла, што ўсе сілы і рэсурсы былі накіраваны на тое, каб мінімізаваць рызыкі ўплыву неспрыяльных умоў надвор'я, у самыя кароткія тэрміны ўбраць і захаваць ураджай. У гэты час вяскоўцам неабходна была падтрымка. І яе аказала дзяржава і аграрная навука.

Такая ўвага развіццю сельскай гаспадаркі для нашай краіны традыцыйная, і разам з тым — гэта аб'ектыўная неабходнасць ва ўмовах нестабільнасці сусветнай харчовай сістэмы. Беларусь у вырашэнні харчовай праблемы прайшла вялікі шлях з пачатку станаўлення незалежнасці.

**Дзейнічаюць дзяржаўныя праграмы, якія ўключаюць тэхнічнае пераасначшэнне вытворчай базы аграрнай галіны, развіццё селекцыі, насенняводства і племяннай справы, мадэрнізацыя сацыяльнай інфраструктуры вёскі і аграгарадкоў. Таксама вядзецца будаўніцтва сучасных жывёлагадоўчых комплексаў, стварэнне новых магутнасцяў перапрацоўчай прамысловасці, умацаванне кадравага і навуковага патэнцыялу на ўзроўні сусветных стандартаў — вось тыя ключавыя рашэнні кіраўніцтва краіны, якія дазволілі дасягнуць самазабеспячэння харчаваннем і па шэрагу пазіцый увайсці ў лік лідараў сусветнага рынку.**

### У СУСВЕТНЫМ ТОПЕ

Як паведаміла Святлана Кандраценка, наша краіна займае 4-е месца сярод сусветных вытворцаў жыта і трыцікале, 10-е — па вытворчасці грэчкі, уваходзіць у топ-20 вытворцаў цукровых буракоў, рапсу, аўса, бульбы.



Па аб'ёмах экспарту малочных прадуктаў рэспубліка ўваходзіць у топ-5, у топ-10 экспарцёраў рапсавага алею і топ-15 — сусветных пастаўшчыкоў мяса і мясапрадуктаў. Попыт на беларускую прадукцыю расце, што дазваляе прадпрыемствам не толькі задавальняць попыт спажыўцоў у дзяржавах-партнёрах па Еўразійскім эканамічным саюзе і СНД, але і штогод асвойваць новыя рынкі далёкай дугі (Пакістан, В'етнам, Катар, ААЭ і іншыя дзяржавы).

Уклад сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі ў эканоміку краіны па выніках 2024 года склаў 6,9 %, удзельная вага ў агульнай колькасці занятых — 6,7 %, у аб'ёме інвестыцый — 12,7 %. Айчынная аграрная галіна развіваецца інтэнсіўна, абапіраючыся на сучасныя тэхналогіі і навуковае забеспячэнне, лічыць эксперт.

Гэта адбываецца дзякуючы паўсюднаму ўкараненню сучасных сартоў сельскагаспадарчых культур, сродкаў абароны раслін, комплексных угнаенняў, забеспячэнню вытворцаў сучаснай энерганасычанай тэхнікай для сяўбы, уборкі і корманарыхтоўкі.

Летась у параўнанні з 2000 годам вытворчасць збожжавых і зернебабовых культур павялічылася ў 1,7 раза, гародніны — удвая, пладоў і ягад — у 2,4 раза, цукровых буракоў — у 3,4, рапсу — больш чым у 14 разоў.

Ураджайнасць збожжавых і зернебабовых за гэты час вырасла ў 1,7 раза (да 33,8 ц/га), бульбы — у 1,6 раза (да 221 ц/га), гародніны — у 2,2 раза (да 299 ц/га), пладоў і ягад — у 3,4 раза (да 112 ц/га), рапсу — у 3,5 раза (да 24,8 ц/га), цукровых буракоў — у 1,6 раза (да 474 ц/га). «Упэўнена, што патэнцыял айчыннай селекцыі і насенняводства значны, і ў перспектыве роля высокаўраджайных сартоў збожжавых, зернебабовых, рапсу і іншых культур у забеспячэнні харчовай бяспекі краіны будзе толькі ўзрастаць», — адзначыла намеснік дырэктара.

«Грамадскае пагалоўе жывёл цяпер канцэнтруецца на высокатэхналагічных комплексах з сучасным даільным абсталяваннем, сістэмамі аўтаматызацыі і лічбавага кантролю працэсаў і ўмоў утрымання», — падкрэсліла Святлана Кандраценка. У малочнай жывёлагадоўлі вынікі ўражваюць: летась у сярэднім па рэспубліцы дасягнуты надой на адну карову 6134 кілаграмы, што на 16 % вышэй за паказчык 2020 года і ў 2,5 раза вышэй за ўзровень 2000-га. Многія гаспадаркі стабільна дасягаюць удою ў 10—13 тысяч кілаграмаў у разліку на адну карову.

**Беларусь здольная забяспечыць малаком яшчэ амаль тры такія ж дзяржавы, паколькі ўзровень самазабеспячэння ў нашай краіне перавышае 290 %. Мы на 140 % забяспечваем сябе мясам, на 130 % яйкамі, больш чым на 100 % бульбай і гароднінай.**

### ЗДАРОВЫ РАЦЫЁН ДАСТУПНЫ ЎСІМ

Наша сельская гаспадарка паспяхова ўкараняе сучасныя лічбавыя рашэнні. Гэта і сістэмы ўліку і аналізу выдаткаў, мадэлі кіравання вытворчасцю, карты прадукцыйнасці палёў, сістэмы дакладнага земляробства і тэхніка, якая абсталявана навігацыйным абсталяваннем. Запатрабаваныя мадэлі прагназавання рынкавай кан'юнктуры, сістэмы кантролю якасці прадукцыі на аснове прымянення блокчэйн-тэхналогій. Прадпрыемствы ўключаюцца ў гэты працэс узважана, супастаўляючы выдаткі, выгады і магчымыя рызыкі. І разам з тым практыка пацвярджае, што лічбавізацыя асноўных бізнес-працэсаў дазваляе істотна павысіць патэнцыял айчынных сельскагаспадарчых тавараvытворцаў і забяспечыць канкурэнтаздольнасць прадукцыі на ўзроўні вышэй замежных аналагаў.

Эксперт лічыць, што развіццё айчыннай сельскай гаспадаркі дэманструе рост індыкатараў дасягнення Мэт устойлівага развіцця. Так, па звестках Белстата, адзначана павелічэнне колькасці генетычных рэсурсаў, прызначаных для сельскай гаспадаркі, якія захоўваюцца на спецыяльных аб'ектах, у тым ліку рэсурсаў раслiннага паходжання — 54348 адзінак (на 24 % больш за паказчык 2020-га), заалагічнага — 28600 тысяч доз (на 13 %).

Міжнародны індыкатар ФАО (харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН), які адлюстроўвае даступную энергетычную каштоўнасць рацыёну харчавання насельніцтва ў параўнанні з сярэдняй патрэбай, у Беларусі ў сярэднім за апошнія тры гады роўны 138 %.

**Сяргей КУРКАЧ.**


Извещение о проведении **28 октября 2025 года** торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование имущества | Год выпуска | Инвентарный номер | Номер шасси | Начальная цена (без учёта НДС), бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1 | Автомобиль МАЗ-6516В9 | 2009 | 5004155 | Y3M6516B990000001 | 33 475,00 | 3 340,0 |
| **Местонахождение имущества:** г. Минск, пер. Промышленный, 7 (перед осмотром просим уточнить местонахождение техники по телефону 8017 395 62 96) | | | | | | |

**Продавец имущества:** ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

**Организатор торгов**: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, код платежа – 40901, назначение платежа – **задаток для участия в аукционных торгах от 28.10.2025 по предмету торгов № 1.**

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **28 октября 2025 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 25.09.2025 по 23.10.2025** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:** (017) 360 42 22 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 395 62 96 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

# БУДУЧЫНЯ ВЫДАВЕЦКАЙ СПРАВЫ

## У БДТУ абмеркавалі неабходнасць мэтавага набору на факультэт прынттэхналогій і медыякамунікацый

Прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі, а таксама выдавецка-паліграфічнай сферы сустрэліся са студэнтамі-першакурснікамі факультэта прынттэхналогій і медыякамунікацый Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта — ён быў і застаецца першым і адзіным у краіне факультэтам, які комплексна рыхтуе кадры для выдавецка-паліграфічнай сферы.



У ходзе сустрэчы «Твая прафесія — твая будучыня» абмяркоўвалі пытанне падрыхтоўкі кадраў. Міністэрства інфармацыі як рэгулятар бачыць зацікаўленасць як з боку прадпрыемстваў паліграфічнай галіны, так і выдавецтваў у арганізацыі мэтавага набору па гэтым кірунку, паколькі кнігавыданню ў краіне ўдзяляецца вялікая ўвага.

Па словах **намесніка міністра інфармацыі Дзяніса ЕЗЕРСКАГА**, важна данесці да маладога пакалення, што тая прафесія, якую яны атрымліваюць, вельмі важная. А рыхтаваць спецыялістаў неабходна сістэмна. «Асноўная задача, якую мы сёння вызначылі, — неабходнасць мэтавага набору — студэнты, якія пасля заканчэння вучобы будуць працаваць на прадпрыемствах паліграфічнай галіны на працягу пяці гадоў», — адзначыў Дзяніс Езерскі. Акрамя таго, пасля заканчэння сустрэчы ён выказаў упэўненасць, што нявспечаныя студэнты зрабілі свядомы крок, выбраўшы менавіта гэту сферу дзейнасці.

Выдавецкая галіна пастаянна рэфармуецца, укараняюцца новыя тэхналогіі, адпаведна, пашыраюцца магчымасці для падрыхтоўкі спецыялістаў. «Наборы апошніх гадоў паказваюць даволі высокую зацікаўленасць моладзі, якая хоча вучыцца рабоце ў выдавецка-паліграфічнай сферы, — падкрэсліў **рэктар БДТУ Ігар ВОЙТАЎ**. — Магу адзначыць, што адукацыя ў нас практыкаарыентаваная, студэнты нямала часу праводзяць на прадпрыемствах. Акрамя таго, вывучаюць малюнак, дызайн, гісторыю кнігадрукавання і многае іншае».

На сустрэчы таксама прысутнічала **намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» Святлана ГАНЦАРЭВІЧ**, якая расказала студэнтам пра структуру выдавецтва, спецыфіку выдання кнігі. Цікава першакурснікам было даведацца, колькі людзей задзейнічана ў падрыхтоўцы аднаго асобніка. «Адно з найбуйнейшых выдавецтваў Беларусі Выдавецкі дом «Звязда» займаецца выпускам мастацкай, публіцыстычнай, вучэбнай, краязнаўчай літаратуры, а таксама дзіцячых кніжак на рускай і беларускай мовах, — расказала намеснік дырэктара. — Упор мы робім на дзіцячую літаратуру, якая займае 70 % ад агульнай колькасці».

**Яна ВАЛАСАЧ.**

**Фота прэс-службы БДТУ.**

# Я ВЫБРАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прафесійна-тэхнічная адукацыя Беларусі ў пачатку кастрычніка адзначае 85-гадовы юбілей. Салідны ўзрост, слаўная гісторыя — ад рамесных вучылішчаў і фабзавучаў да каледжаў, ад падраздзяленняў вытворчага навучання да цэнтраў кампетэнцый. І сур'ёзныя задачы — забеспячэнне навукаёмістых і высокатэхналагічных вытворчасцяў галін эканомікі высокакваліфікаванымі кадрамі. Сёння ў гэту гісторыю ўпісваюцца новыя старонкі, расказаць пра якія папрасілі **рэктара Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Валерыя ГАЛУБОЎСКАГА.**

## КУЗНЯ СУЧАСНЫХ КАДРАЎ

— Сістэма прафесійнай адукацыі павінна аператыўна рэагаваць на любыя выклікі часу, а галоўны яе прыярытэт — забеспячэнне тэхналагічнага суверэнітэту эканомікі краіны, — адзначыў ён. — Укараненне сучасных тэхналогій размывае грань паміж рабочым, тэхнікам, як спецыялістам сярэдняга звяна, і інжынерам. Спецыялісты становяцца ўсё больш універсальнымі, выконваючы функцыі і рабочага, і арганізатара малых груп работнікаў, скажам, на ўчастках. Яны выкарыстоўваюць інжынерныя веды з ужываннем праграмнага забеспячэння і гэтак далей. У выніку, да сённяшняга дня мы прыйшлі, аб'яднаўшы праграмы прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і кароткатэрміновыя праграмы дадатковай адукацыі дарослых.

Спыніўшыся на дадатковай адукацыі, Валерый Мікалаевіч падкрэсліў, што гэта — таксама частка сістэмы падрыхтоўкі працоўных рэсурсаў.

— Чалавек так арганізаваны або такія абставіны складваюцца, што на працягу ўсяго жыцця перыядычна мяняе прафесійную траекторыю, — тлумачыць ён. — Важным момантам лічу тое, што ў Беларусі ў стваралася паралельная сістэма дадатковай адукацыі па лініі, скажам, Мінпрацы. Вельмі рацыянальны падыход, калі ведамства замест выдаткаў на стварэнне сваіх навучальных цэнтраў выкарыстоўвае базу каледжаў, каб накіроўваць на перавучванне, напрыклад, беспрацоўных.

Па словах суразмоўцы, многія прадпрыемствы для павышэння ўзроўню кваліфікацыі сваіх работнікаў наўпрост звяртаюцца ў каледжы, таму што ведаюць: там ёсць і майстры, і добрыя вытворчыя базы. У якасці прыкладу Валерый Галубоўскі прывёў сітуацыю, калі ўводзіліся новыя прынцыпы школьнага харчавання. Тады ў харчаблокі ўсталёўвалася новае сучаснае абсталяванне, абнаўляліся тэхналагічныя карты, а кухары масава навучаліся на дадатковых курсах, каб павысіць свой разрад да неабходнага.

## ЗАМЕСТ НОВАЙ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ — МОДУЛЬ

Сучасныя тэхналогіі распаўсюдзіліся на ўсе аспекты чалавечага жыцця, яны мяняюцца вельмі імкліва і патрабуюць гнуткасці ў розных сферах прымянення, асабліва ў тых, якія спецыялізуюцца на падрыхтоўцы кадраў.

— Таму мы лічым вельмі важным ствараць умовы для аператыўнага рэагавання на гэтыя змены ў сістэме прафесійнай адукацыі, — расказвае рэктар інстытута. — Адным з эфектыўных інструментаў такога рэагавання з'яўляюцца адукацыйныя модулі.

Як растлумачыў наш суразмоўца, адукацыйны модуль у падрыхтоўцы кадраў — гэта структураваная частка праграмы навучання, накіраваная на набыццё канкрэтных актуальных кампетэнцый, якіх не было раней.

— Узяць той жа рамонт аўтамабіляў, — прыводзіць прыклад ён. — Спецыялісты ў гэтай сферы абслугоўвання былі і 10, і 20 гадоў таму, цэняцца і цяпер. Аднак прыйшоў час, і традыцыйныя машыны сталі спачатку павольна, а сёння ўжо імкліва змяняць электракары. Але гэта не азначае, што трэба тэрмінова ўводзіць новую спецыяльнасць — дастаткова ў наяўную праграму па падрыхтоўцы аўтаслесараў уставіць модуль, па якім будуць вывучаць спецыфіку, прылады і

Информационное сообщение о проведении открытого аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Скураты, ул. Виноградная, 11А Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

**Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет**, 222215, **аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д.** 27, **Смолевичский район, Минская область**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Скураты, ул. Виноградная, 11А** | 624883009 101000238 | 0,0694 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | 20000 |

Аукцион состоится **29 октября 2025 г. в 15.00** в Озерицко-Слободском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Смолевичский район, Минская область, зал заседаний (тел. 801776, 50066). Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственный комитет по имуществу: **https://au.nca.by/**, Минский областной исполнительный комитет: **https://info@minsk-region.gov.by**, Смолевичского райисполкома: **isp@smolevichi.gov.by.**

УНП 600046563

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже земельных участков гражданам Республики Беларусь в частную собственность

**Организатор электронных торгов**: Дукорский сельский исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, аг. Дукора, ул. Речная, 14, тел.: (801713) 63935, 31636.
**Оператор электронной торговой площадки**: открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»
**Электронный адрес электронной торговой площадки**: www.et.butb.by. Дата проведения электронных торгов: **27 октября 2025 года.**
**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| Адрес земельного участка | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена (рублей) | Задаток, руб. | Расходы по подготовке документации (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Минская область, Пуховичский р-н, д. Малиновка, 11** | 624483403401000030, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | 0,1501 | Сети электроснабжения | 5500,00 | 550,00 | 2500,66+ Стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| **Минская область, Пуховичский р-н, аг. Дричин, ул. Парковая, 10** | 624483402001000323, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | 0,1500 | Сети электроснабжения, газоснабжения | 11000,00 | 1100,00 | 1638,03+ Стоимость объявления в СМИ и ЭТП |

Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ «Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в электронных торгах. Назначение платежа: внесение суммы задатка на участие в торгах. Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми к ним документами – **22 октября 2025 года до 15.00.**

Оплата стоимости предмета торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник – пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату за земельный участок, продаваемый в частную собственность.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 1 апреля 2014г № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство объектов распределительной транспортной инфраструктуры к такому земельному участку».

# КАЛЕДЖ!

тэхналогіі абслугоўвання транспартнага сродку з электрарухавіком. І так — у любой іншай сферы.





## ЭЛЕКТРОННЫ КАЛЕДЖ

Трэці год у сямі каледжах краіны пілатуецца праект па ўкараненні аўтаматызаванай сістэмы кіравання «Электронны каледж».

— Аўтаматызацыю адміністрацыйных і навучальных працэсаў з дапамогай інфармацыйных сістэм плануем дапрацаваць і запусціць ва ўсіх каледжах у наступным годзе, — дзеліцца Валерый Галубоўскі. — Сістэма не толькі дапаможа адысці ад руціннай аперацыйнай работы з папяровымі носьбітамі — яна будзе ўзаемадзейнічаць з рэспубліканскім інфармацыйным адукацыйным асяроддзем, якое таксама пакуль яшчэ дапрацоўваецца. Усё гэта дасць магчымасць вызваліць час для таго, каб у метадыстаў і педагогаў з'явіўся рэсурс для ўласнага развіцця, развіцця моладзі і, у канчатковым выніку, удасканалення якасці адукацыйнага працэсу. Гэта ў кіраванні. У змесце адукацыі памочнікам павінен стаць штучны інтэлект. І ў нашай сістэме ён будзе найбольш карысным, таму што сёння ў прафесійнай адукацыі выкарыстоўваецца шмат тэхналогій, схаваных ад вока чалавека. А разумець, што адбываецца ўнутры, трэба.

## ЦЭНТРЫ КАМПЕТЭНЦЫІ

— У сусветнай практыцы такія цэнтры называюцца кампетэнтнаснымі, цэнтры прафесійных кампетэнцый, рэсурсныя цэнтры, — расказвае Валерый Мікалаевіч. — Ствараючы свае цэнтры кампетэнцый, мы, вядома, выкарыстоўвалі сусветны вопыт, таму што сутнасць такіх структур, нягледзячы на розныя назвы, аднолькавая: рацыянальна і эфектыўна выкарыстоўваць укладанне рэсурсаў у падрыхтоўку кадраў. Для гэтага на адной пляцоўцы па профілі падрыхтоўкі канцэнтруюцца самыя перадавыя тэхналогіі, абсталяванне, інструменты, праграмнае забеспячэнне. У нашай сістэме працуюць 53 цэнтры кампетэнцый па 9 відах эканамічнай дзейнасці, і ўсе яны раўнамерна размеркаваны па краіне.

Кіраўнік РІПА растлумачыў, што ў кожнай вобласці профіль цэнтра завязаны на рэгіянальнай эканоміцы. У Мінску няма сельскагаспадарчага профілю, затое ёсць машынабудаўнічы і будаўнічы. Існуюць цэнтры па грамадскім харчаванні, швейнай вытворчасці і іншыя.

— Забяспечыць кожны каледж сучасным перадавым абсталяваннем немагчыма, — дзеліцца Валерый Галубоўскі. — Ды і не мае сэнсу: для асваення базавых навыкаў у кожным з іх ёсць майстэрні. Але асвойваць перадавую тэхналогію, скажам, зварку каляровых металаў, у адным цэнтры кампетэнцый могуць адразу некалькі профільных каледжаў.

Наш суразмоўца расказаў, што такім жа чынам ідзе работа і ў рэгіёнах. Самы вялікі блок машынабудаўнічых прадпрыемстваў — у Мінску, Віцебскай і Гомельскай абласцях, там і працуюць цэнтры кампетэнцыі адпаведнага профілю. У іншых рэгіёнах, такіх, напрыклад, як Магілёўскі або Брэсцкі, такой колькасці прамысловых прадпрыемстваў няма — значыць, і няма неабходнасці ствараць там цэнтры кампетэнцыі, а навучэнцы могуць прайсці навучанне ў Мінску, Гомелі ці Віцебску.

— Калі ўзяць аграрны профіль, — працягнуў рэктар РІПА, — то цэнтры кампетэнцый ёсць практычна ў кожным рэгіёне. І ў іх ужо ўкаранёны лічбавыя рашэнні па дакладным земляробстве, цяпер праграма дапаўняецца яшчэ адным перспектыўным напрамкам — кіраваннем беспілотнікамі, якія будуць уносіць угнаенні, аналізаваць глебу і гэтак далей.

## PROFSKILLS — ДАРОГА Ў БУДУЧЫНЮ

Першы конкурс прафесійнага майстэрства па міжнародных стандартах прайшоў у Беларусі ў 2014-м. За гады існавання ён зарэкамендаваў сябе як важнае мерапрыемства і пляцоўка для павышэння прэстыжу рабочых прафесій, дэманстрацыі прафесійных навыкаў і прыцягнення моладзі да засваення новых спецыяльнасцяў. Тое, што маладыя людзі праяўляюць цікавасць да ўдзелу ў конкурсе, горача вітаецца. Але як далей развіваецца прафесійная дзейнасць гэтых таленавітых дзяцей, наколькі зацікаўлены ў іх прадпрыемствы?

— ProfSkills — фестываль прафесій, свайго роду агледзіны таленавітых і матэнакіраваных юнакоў і дзяўчат, — гаворыць Валерый Галубоўскі. — І агледзіны гэтыя ў вялікай ступені ладзяцца менавіта для прадпрыемстваў, якія, дарэчы, прымаюць самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы пляцовак і іншых конкурсных мерапрыемстваў, дапамагаючы абсталяваннем і матэрыяламі. На самім конкурсе патэнцыяльныя работадаўцы назіраюць за канкурсантамі, бачаць узровень адказнасці, самастойнасці, ацэньваюць складанасць работ і наколькі гэты малады чалавек для іх важны і патрэбны ў сённяшніх умовах. Магу сказаць, што ўжо не адзін год і не першы ўдзельнік рэспубліканскага этапу атрымаў прапановы работы непасрэдна на конкурснай пляцоўцы. Прычым гэта былі спецыялісты ў самых розных сферах: і сантэхнікі, і зваршчыкі, і станочнікі, і кухары. Ведаю, што ўжо не адзін цырульнік адкрыў сваю справу. Ёсць прыклады, калі юнакі і дзяўчаты — пераможцы і дыпламанты конкурсу — становяцца маладымі шэф-кухарамі, і літаральна праз два гады пасля заканчэння каледжа пад такога спецыяліста адкрываюць рэстаран.

Прыкладаў яркага прафесійнага і кар'ернага росту ў конкурсным руху нямала. На думку кіраўніка РІПА, надыходзіць пэўны пералом мыслення, і моладзь усведамляе: калі выступіш добра, перад табой адкрыюцца прывабныя перспектывы. А каб выступіць добра, ты павінен рыхтавацца, унікаць у складаныя заданні, трэніравацца.

— Вядома, не ўсе становяцца кіраўнікамі, не кожны адкрывае сваю справу, — гаворыць суразмоўца. — Кагосьці шануюць на прадпрыемстве як высакакласнага работніка, хтосьці прыходзіць у прафесійную адукацыю майстрам-выкладчыкам і ўжо сам рыхтуе канкурсантаў да міжнародных чэмпіянатаў. Такім чынам, у сістэме прафадукацыі ўжо сфарміраваліся дынастыі — не сямейныя, але прафесійныя. І гэта таксама выдатнае развіццё конкурснага руху.

## ПРА ВЫХАВАННЕ

— Захоўваючы традыцыі сістэмы прафтэхадукацыі, якая ўлілася ў агульную сістэму прафесійнай адукацыі, мы па-ранейшаму працуем на дзіця і яго развіццё, — разважае Валерый Галубоўскі. — У каледж паступае 15-гадовы падлетак, па сутнасці, яшчэ дзіця з усімі асаблівасцямі пераходнага ўзросту, не заўсёды з поўнай сям'і, часам з цэлым шлейфам заўваг і парушэнняў. Мы стараемся зрабіць усё, каб накіраваць яго на правільны шлях. Спорт, музыка, мастацкая самадзейнасць. Падлеткі ахвотна ўступаюць у атрады аховы правапарадку і ўдзельнічаюць у валанцёрскім руху. І што мы бачым? Большасць дзяцей выраўноўваюць сваю траекторыю як чалавека, асобы, грамадзяніна і патрыёта. Лічу, у гэтым і ёсць наша галоўнае прызначэнне.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


## Извещение об открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 28 октября 2025 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Сергея Болгарина, 12 У-619, микрорайон «Заболоть» 440100000002008162** | 0,1017 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, наружная площадь 127 кв. м; фундамент: железобетон, готовность 12 % | 38 133,49 (9 555,79; 28 577,70) | 391,14 | 7 600,00 |

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр. (при их наличии), точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок с момента подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок. Победитель аукциона обязан в течение срока строительства возместить затраты на инженерную и транспортную инфраструктуру согласно индивидуально разработанному проекту в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 и решением Гродненского городского исполнительного комитета от 03.04.2025 № 249.

**Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: +375 (152) 626055, 626056.**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 28 октября 2025 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

**Прием документов, консультации и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 29 сентября по 22 октября 2025 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## ОАО «Н Холдинг» проводит открытый повторный аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «МПОВТ»

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | |
|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 600/С-182222, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/20, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 17,0 кв. м. Наименование: Склад 24 кв. м (инв. № 28909). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 20А1/к-Склад (инв. № 28909). Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-183140, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/31, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 33,0 кв. м. Наименование: Трансформаторная подстанция. Назначение: Сооружение специализированное энергетики. Составные части и принадлежности: 31А1/к-Трансформаторная подстанция.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-182229, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/23, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 466,1. Наименование: Металлический склад (инв. № 32949). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 23А1/к-Металлический склад. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-183138, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/32, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 102,2 кв. м. Наименование: Пристройка к ТП. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 32А/к-Пристройка к ТП.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-182230, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/22, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 11,6 кв. м. Наименование: Помещение ВОХР (проходная №1) (инв. № 32953). Назначение: Здание проходной (в том числе контрольно-пропускного пункта). Составные части и принадлежности: 22А1/к-Помещение ВОХР (проходная № 1) (инв. № 32953). Обременение: аренда.<br>Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692 площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **563 727,35** | **Задаток, BYN** | **56 372,35** | **Шаг аукциона** | **5 %** |

| | |
|---|---|
